ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

АЎТОРАК, 6 ВЕРАСНЯ 1938 г. № 49 (391)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

НЯХАЙ ЖЫВЕ XXIV МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ—ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ ЎСЯГО СВЕТУ СУПРОЦЬ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ і ФАШЫЗМА, ЗА МІР, ЗА СОЦЫЯЛІЗМ!

МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ

Дваццаць чатыры гады аддаляюць нас ад таго дня, калі ў разгар імперыялістычнай вайны—у 1915 годзе — на канферэнцыі левых соцыялістычных арганізацый моладзі ў Берне было вырашана святкаваць Міжнародны юнацкі дзень. Гэтае рашэнне выражала баявы пратэст перадавой рэволюцыйнай моладзі супроць імперыялістычнай вайны.

XXIV. Міжнародны юнацкі дзень з'яўляецца днём барацьбы працоўнай моладзі ўсяго свету супроць вайны і фашызма, за мір, за соцыялізм. У гэты дзень маладыя пролетарыі, працоўная моладзь капіталістычных краін выступяць адзіным фронтам для барацьбы супроць фашызма—смяротнага ворага працоўнага чалавецтва, з лозунгамі брацкай салідарнасці з гераічнай рэспубліканскай Іспаніяй, з кітайскім народам, які змагаецца супроць японскіх захватчыкаў за сваю незалежнасць.

Шчаслівая моладзь Совецкага Саюза святкуе XXIV Міжнародны юнацкі дзень пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, прадаставіўшай совецкай моладзі права на працу, на адпачынак, на адукацыю, нябачаныя ў гісторыі палітычныя правы. Яна выступае ў гэты дзень пад лозунгамі авалодання большэвізмам, узмацнення большэвіцкай пільнасці, пад лозунгам узмацнення абароназдольнасці нашай соцыялістычнай радзімы.

Народ Совецкай краіны сваіх лепшых сыноў і дачок абкружыў вялікім давер'ем і паслаў іх у першы соцыялістычны парламент Саюза ССР, саюзных і аўтэномных рэспублік. Баявое, маладое совецкае пакаленне складае 43 проценты ўсяго нашага насельніцтва.

Маладыя байцы і комсамольцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі гераічна змагаліся на манчжурскай граніцы і выгналі самураяў з совецкай тэрыторыі. Тысячы маладых дачок па закліку патрыёткі радзімы Хетагуравай паехалі на Далёкі Усход для асваення гэтага края. Комсамольцы і совецкая моладзь пабудавалі на рацэ Амур горад Комсамольск.

Іх вясёлых і бадзёрых—дзесяце тысяч комсамольцаў—мы бачым на будаўніцтве гігантаў соцыялістычнай індустрыі. Не менш іх і ў сельскай гаспадарцы на адказных участках, у соўгасах і калгасах. Вось яны, першыя пачынальнікі стаханаўскага руху, які пачаў малады шахцёр Стаханаў, цвет соцыялістычнай радзімы, комсамольцы—Крываносаў, Дземчэнка, Гнаценка, Ангеліна, Вінаградава. Комсамольцы і моладзь ёсць і сярод заваявальнікаў Паўночнага полюса, сярод выдатных лётчыкаў і сярод музыкантаў, атрымаўшых першыя сусветныя прэміі. Гэта цудоўнае маладое пакаленне сталінскай эпохі.

Комуністычная партыя і совецкі ўрад клапатліва вырашчваюць падрастаючую змену. Толькі за дзве пяцігодкі наша краіна выдаткавала пяцьдзесят мільярдаў рублёў на народную асвету. Памятаючы ленінска-сталінскія заветы—вучыцца, авалодваць вышынямі перадавой навукі—марксізмам-ленінізмам, моладзь упарта вучыцца і авалодвае ведамі, накопленымі чалавецтвам.

Імёны Пушкіна, Горкага, Руставелі, Шаўчэнка, Гётэ, Гейне і іншых пісьменнікаў свету сталі блізкімі для нас. Іх творы чытае і вывучае наша моладзь. Гэта ў той час, калі ў Германіі закрываюць універсітэты, тэатры, бібліятэкі, знішчаецца мастацтва, на кастрах паляць геніяльныя творы Гётэ, Гейне, Шылера, М. Горкага.

Владзімір Ільіч Ленін ускладаў вялікія надзеі на моладзь. Яшчэ ў 1920 годзе, гаворачы аб задачах саюзаў моладзі, ён прадбачыў:

«... тое пакаленне, якому зараз пятнаццаць год, яно і ўбачыць комуністычнае грамадства, і само будзе будаваць гэтае грамадства.

І яно павінна ведаць, што ўся задача яго жыцця ёсць будаўніцтва гэтага грамадства».

І гэта добра памятае совецкая моладзь. Пад слаўным кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе кормчага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна наша маладое пакаленне ў нагу з усім совецкім народам ідзе ад перамогі да перамогі, упэўнена крочачы да комунізма.

Дасягненні Совецкага Саюза натхняюць комсамольцаў і ўсю працоўную моладзь свету на барацьбу супроць фашызма, за соцыялізм. Яны бачаць, што толькі на адной шостай частцы зямнога шара сонца радасна свеціць усім народам, а над сусветам на ўсходзе і захадзе палае вогнішча вайны. Японскія, нямецкія і італьянскія агрэсары варварскі знішчаюць кітайскае, іспанскае і абісінскае насельніцтва.

Барацьба іспанскага народа супроць унутранага і замежнага фашызма — агульная справа ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Іспанскі народ гераічна змагаецца за сваю незалежнасць і свабоду.

Кітайскі народ змагаецца супроць японскіх захватчыкаў. У першых радах гэтых змагароў знаходзяцца члены комуністычнай партыі і члены комуністычнага саюза моладзі Кітая. Кітайскі народ штодня атрымлівае ўсё новыя і новыя перамогі.

Бяспраўна, у дзікай галечы, у рабскай эксплаатацыі жыве моладзь у капіталістычных краінах. У 32 буржуазных дзяржавах Еўропы і Амерыкі налічваецца каля 7 мільёнаў беспрацоўнай моладзі,—гэта толькі па няпоўных даных Лігі нацый. Фашысты Германіі, Польшчы надумалі новы спосаб ліквідацыі беспрацоўя — яны пасылаюць моладзь працаваць у лагеры прымусовай працы, дзе дзікa іх эксплаатуюць, здзекуюцца і мораць голадам.

У Польшчы ў сельскай гаспадарцы налічваецца каля 9 мільёнаў беспрацоўных. У гэты лік беспрацоўных уваходзіць усё маладое пакаленне польскай вёскі. Жаночая моладзь Японіі, Германіі і Польшчы пастаўлена ў такія матэрыяльныя ўмовы, што яна павінна ці паміраць з голаду, ці ісці гандляваць сваім целам.

Як-бы ні прыгняталі моладзь капіталісты, як-бы з яе ні здзекваліся фашысты,—заганяючы комсамольскія арганізацыі ў падполле, нявінна саджаючы моладзь у казематы і расстрэльваючы яе,—міжнародная барацьба супроць фашызма за мір штодзенна ўзрастае. Саракамільённая армія маладога пакалення актыўна дапамагае братам па барацьбе, кітайскаму і іспанскаму народу, бо яна ведае, што падпальшчыкаў вайны можна перамагчы толькі адзіным фронтам, калі ўсе народы аб'яднаюцца пад сцягам барацьбы за мір і дэмакратыю.

У дружнай сям'і народаў СССР на заходніх рубяжах з капіталістычным светам расце і квітнее Совецкая Беларусь.

БССР з'яўляецца рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У ёй налічваецца 7096 школ, дзе навучаецца звыш мільёна дзяцей працоўных; у 98 тэхнікумах навучаецца 32976 студэнтаў; у 23 ВНУ — 14.626 студэнтаў. У школах працуе 32.050 настаўнікаў. Штогод нашы навучальныя ўстановы выпускаюць тысячы маладых спецыялістаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве.

Расце літаратура і мастацтва Совецкай Беларусі, растуць таленавітыя маладыя літаратары з рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі; маладыя кампазітары пішуць совецкія беларускія оперы; тысячы маладых талентаў выхоўвае самадзейнае мастацтва. Народ стварае цудоўныя творы, якія ўслаўляюць сталінскую радасную эпоху; шмат таленавітай моладзі расце ў тэатрах, мастацкіх навучальных установах (у кансерваторыі, музшколах, у мастацкім і тэатральным вучылішчы), у выяўленчым мастацтве. Нябачаны рост соцыялістычнай гаспадаркі і культуры СССР забяспечвае непераможная ленінска-сталінская палітыка.

Сёння мы святкуем МЮД, калі ленінска-сталінскаму комсамолу спаўняецца дваццаць год. Гэтыя годы былі гадамі сапраўднай барацьбы пад сцягам партыі Леніна—Сталіна за шчасце працоўных, за комунізм.

Яшчэ больш узмацнім рэволюцыйную пільнасць! Пакончым з палітычнай бяспечнасцю ў нашым асяроддзі!

Шчыльней згуртуемся вакол вялікай большэвіцкай партыі! Умацуем інтэрнацыянальную дружбу ўсіх народаў свету!

Няхай жыве непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна! Аддадзім усе нашы сілы, усю нашу маладосць вялікай справе комунізма!





Народны Камісар Абароны Саюза ССР маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. ВАРАШЫЛАЎ

НА ТАКТЫЧНЫХ ВУЧЭННЯХ ЧАСЦЕЙ МАСКОЎСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

РАЁН ВУЧЭННЯЎ. 3 верасня ў раён вучэнняў часцей Маскоўскай ваеннай акругі прыбыў народны камісар абароны СССР маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылаў.

Тав. Варашылава сустрэлі: камандуючы войскамі МВА маршал Совецкага Саюза тав. Будзённы і члены Ваеннага Совета МВА, сакратар Маскоўскага камітэта ВКП(б) тав. Угараў і дывізійны камісар тав. Запарожац.

З раніцы да позняга вечара 3 і 5 верасня тав. Варашылаў правяраў дзеянні падраздзяленняў і часцей, якія прымаюць удзел у вучэннях, работу штабаў па кіраванню боем і гутарыў з байцамі, камандзірамі і палітработнікамі.

Войскі і насельніцтва раёна вучэнняў цёпла і радасна сустракалі тав. Варашылава.

(БЕЛТА).

Якуб Колас

СІЛА МАЛАДАЯ

Што ні дзень, што ні час
Наша сіла расце,
Сіла маладая.
Хто ні гляне на нас,
Сам, як май, расцвіце,
Вёсны прыгадае.

Як разводдзе вясной,
Як той шум гразавы
Ідзе сіла гэта,
Бо суровай вайной
Кован дух баявы,
Сталіным сагрэты...

Бездань сініх глыбінь,
Дзікай Арктыкі лёд
Сталі нам вядомы.
Нам няма далячынь,
Нам няма перашкод —
Усюды мы як дома.

А дарог-жа, дарог
Ды прасторных такіх,
Што яснотай дышуць!
Не шкадуй толькі ног,
Сваіх сіл маладых
Ды ўзнімай сцяг вышэй.

Свет эбянтэжан стары
І са страхам глухім
На нас паглядае.
Мкне, бы камень з гары,
Нестрыманы нікім,
Сіла маладая.

Хто-ж пасмее спыніць,
Затрымаць яе ход!..
Памятайце, гады:
Білі вас, будзем біць,
Зграі чорныя, зброд —
Не чакай ашчады...

Эх, ды дзе і калі,
У краіне якой
Хто меў столькі волі,
На совецкай зямлі
Грае бурнай ракой
Наш разгон саколлі...

Што ні дзень, што ні час
Наша сіла расце,
Сіла маладая.
Хто ні гляне на нас,
Сам, як дзень, расцвіце —
Хто нам спагадае.

АБАРОНА і ФІЗКУЛЬТУРА

Натоўп рухаўся да стадыёна «Дынамо». Усе спяшаліся, каб не спазніцца на свята беларускіх фізкультурнікаў. К вызначанаму часу трыбуны і праходы былі перапоўнены гледачамі.

... Раптам пачуўся клёкат матораў. З сярэдняй брамы стадыёна выехаў матацыкл. Над ім узвышаўся чырвоны сцяг з вытканымі партрэтамі вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна. Побач з палыхаючым сцягам стаялі два фізкультурнікі з вінтоўкамі і дзяўчына з гранатай. Усе яны напружана ўгляда́ліся ў далеч. Гэтая фізкультурная група нагадвае нам, што народ нашай рэспублікі пільна ахоўвае межы Совецкага Саюза на заходняй граніцы.

Потым адзін за адным выязджаюць матацыклы і на іх пастаментах па тры-чатыры і нават па пяць студэнтаў фізкультурнага інстытута дэманструюць прыгожыя акрабатычныя фігуры.

На зялёнае поле выляцела некалькі сініх птушак—гэта матацыклы, аформленыя ў выглядзе самалётаў-знішчальнікаў. Наперадзе іх, ля руля, тырчаць кулямёты і гудуць прапелеры. Вадзіцелі, апранутыя ў камбінезоны, супроцьіпрытныя касцюмы, у процігазах, дзяўчаты з санітарнымі сумкамі за плячыма, выдатна кіруюць машынамі.

Бадзёра выбеглі 400 менскіх школьнікаў. Яны ўпрыгожылі поле вянкамі і букетамі жывых кветак. Імі быў выканаы масавы танец, які закончваўся салютам таварышу Сталіну, даўшаму совецкім дзецям шчаслівае дзяцінства.

Тысячы гледачоў апладыравалі ў гонар вялікага Сталіна.

Дзяцей змянілі фізкультурнікі Палесся. Яны дэманструюць комплекс гімнастычных рухаў. Потым спартсмены становяцца ў круг і ўступаюць месца ансамблю песні і танца Хойніцкай МТС, які выканаў пад воплескі фізкультурнікаў і гармонік народны беларускі танец «Крыжачок». У першых парах танцавалі старыя калгаснікі. Раптам танец змяняецца сігналам «трывогі». Узброеныя фізкультурнікі з любімай песняй совецкага народа «Если завтра война» дэманструюць сваю гатоўнасць даць адпор ворагам. Шчыльным строем яны пакідаюць стадыён.

На зялёні поля з'яўляецца піраміда самалёта. Піраміда распалася, загарэлыя, мускулістыя фізкультурнікі спартыўнай школы Менска паказваюць яшчэ некалькі цікавых пірамід.

З абодвух бакоў стадыёна данасілася песня «Жыць стала лепш, жыць стала весялей». Як на гульбішчы, узяўшыся за рукі, двума шарэнгамі ішлі насустрач адна адной фізкультурнікі і фізкультурніцы Магілеўскай вобласці. У іх выступленні прымае ўдзел шмат дзяцей, якія прыгожа танцуюць «Лявоніху». «Трывожны сігнал» з'яднаў фізкультурнікаў у баявыя калоны. Грозна і голасна гучаць патрыятычныя словы: «Пяди одной не уступим врагу». Над калонамі рэзе чырвоны сцяг, над галовамі фізкультурнікаў узвышаецца партрэт вялікага Сталіна. Пад сцягам большэвіцкай партыі, з імёнамі Леніна і Сталіна ў сэрцах пойдзе совецкі народ абараняць соцыялістычную радзіму, калі ворагі навяжуць нам вайну.

На стадыёне вырас малады ельнік. За дрэвамі з вінтоўкамі залеглі фізкультурнікі Гомельскай вобласці. Узброеныя спартсмены паказалі бой з перабежкай, як спрытна і лёгка яны ўмеюць калоць штыком і біць прыкладам і рад іншых практыкаванняў з вінтоўкамі. Сярод шарэнгаў хлопцаў выбеглі дзяўчаты і разам яны выканалі прыгожыя гімнастычныя рухі. З загарэлых мускулістых цел будуюцца адна за адной змястоўныя і прыгожыя піраміды.

Над стадыёнам вырасла Крэмлёўская вежа з бронзавых цел фізкультурнікаў Віцебскай вобласці. Побач з вежай палымнеюць вялікія чырвоныя сцягі. Хутка рассыпаўшыся па полю дзяўчаты дэманструюць сваё гімнастычнае майстэрства. Лёгка і рытмічна цяжкаатлёты выконваюць практыкаванне з гірамі. Шчаслівая моладзь радасна спявае і танцуе. Дзеці выконваюць танец з рознакаляровымі абручамі. Па сігналу «трывога» на поле вылятаюць імправізаваныя знішчальнікі. Выстрайваюцца ўзброеныя калоны. Сцены мірнага Крэмля ашчаціньваюцца гарматамі. Інсцэніруецца штыхавы бой. Гэтае цікавае выступленне сцвярджае, што ў нас ёсць што абараняць, ёсць каму абараняць, ёсць чым абараняць. Па ўсяму стадыёну разносяцца словы песні пакідаючых стадыён фізкультурнікаў:

«На вражьей земле мы врага разобьем
Малой кровью могучим ударом».

Вялікая запалкавая каробка, абрамленая ельнікам, служыла дэкарацыйным упрыгожаннем выступлення барысаўскай дэлегацыі. Спартсмены Барысава паказалі шмат цікавых спартыўных практыкаванняў і бадзёрыя танцы.

Свята совецкіх беларускіх фізкультурнікаў закончыў ордэнаносны інстытут фізкультуры БССР.

На стадыён выязджае «поезд — экспрэс», упрыгожаны кветкамі. Гэты імправізаваны скарасны паравоз і вагоны знаёмы ўсяму Совецкаму Саюзу. Іх бачыла чырвоная Масква, любімы наш правадыр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і яго баявыя саратнікі. З «поезда» выбягаюць дзесяткі юнакоў. Дэманструюць зарадку. Зацейлівыя і вынаходлівыя піраміды змяняюцца адна лепш за другой. Студэнты здзіўляюць культурай выканання. Яны дасканала валодаюць сваім майстэрствам. Іх целы добра натрэніраваны. Лёгка яны выконваюць і танцы.

«Трывога» прымушае іх падрыхтавацца да «бою». Танцуючыя пары ўжо з вінтоўкамі. Непрыкметна для гледачоў «экспрэс» ператвараецца ў броню. На «паравозе» з'яўляецца блізкае і роднае імя «Клім Варашылаў». Удзельнікі выступлення будуюць велізарную піраміду.

Звыш двух гадзін доўжыўся цудоўны паказ сілы, мужнасці, характва маладога пакалення совецкіх фізкультурнікаў.

Фізкультурнікі БССР прадэманстравалі сваю гатоўнасць абараняць радзіму ў кожную мінуту, калі гэтага будзе патрабаваць большэвіцкая партыя, урад, таварыш Сталін.

Совецкі народ можа ганарыцца такой моцнай і бадзёрай зменай, вартай свайго народа.



ПАРАД ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ У МЕНСКУ

На здымку: байцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі на парадзе 30 жніўня.

АДДАДЗІМ УСЕ НАШЫ СІЛЫ, УСЮ ПАЛКАСЦЬ НАШАЙ МАЛАДОСЦІ ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ КОМУНІЗМА!

Павел Хадарэнка

ВЕЛІЧ СЭРЦАЎ НАШЫХ

Узнялося сонца, свеціць над краінай
Сонца чалавецтва — Сталін дарагі,
Поглядам гарачым, поглядам арліным
Акідае нівы, пашы, мурагі.
Сваё сэрцы людзі праз лясы і гоні,
Праз руччы і рэкі прыняслі туды,
Дзе з трыбуны шчасця выступае
сёння
Веліч сэрцаў нашых —
мудры правадыр.
Сталін слова скажа — гарады ўзра-
стаюць,
І цвітуць на поўначы кветкі і сады,
У нашы хаты рэчкамі радасць
прыбягае;
Яе шле народам
мудры правадыр.
На трыбуну—бачу—юнакі,
дзяўчаты
Сваіх ніў багатых прынеслі плады,
Ен жыве у саклях, ён жыве ў хатах
Веліч сэрцаў нашых —
мудры правадыр.
Вартавы з заставы выступае ноччу
Берагчы радзімы сёлы, гарады,
З ім стаіць на варце, з ім усюды
крочыць
Веліч сэрцаў нашых —
мудры правадыр.
У святліцы-школы раніцой зімовай
Дзеці йдуць, і льецца песня
маладых,
З імі проста, шчыра распачаў размову
Веліч сэрцаў нашых —
мудры правадыр.
Папанін з сябрамі на ільдах
стагодніх
Вогнішча запаліць—нікнуць халады,
З імі неаддучна у шынелі ходзіць
Веліч сэрцаў нашых —
мудры правадыр.
Бурных мораў шквалы біцца
перасталі,
І вятры не водзяць снежны карагод—
З сонечнай радзімай размаўляе
Сталін,
Ленінскія словы слухае народ.

Аляксандр Матвееў

СМЕРЦЬ ПАГРАНІЧНІКА

З табой у дружбе мы мужнелі.
Хадзілі ў школу мы па трактах.
Вясна была.
Сады квітнелі.
Вадзіў ты на палі свой трактар.
Нам ліўні падалі на плечы.
Мы хлеба вырасцілі—горы.
І да дзяўчыны
кожны вечар
Шагаў ты радасны, бадзёры.
Я помню восень —
у вільготным дыме
Пажоўклы наш калгасны сад стаяў.
Мы ў армію ішлі
байцамі маладымі, —
Быў кожны рад: смяяўся і спяваў.
Чатыры разы ў вёсцы, на азёрах
Крычалі качкі, скончыўшы свой пуць.
Чакала любая цябе на зорах,
Чакала,
не магла ўначы заснуць.
***
Ты ў зямлі ляжыш.
і над табою
Птушыны хор жалобаю звініць.
Ты ў бітве з ворагамі паў героем.
Ля возера Хасан,
на спадзе вышыні.
Ты смерцю храбрых паў.
Цяжкая страта!
Ахутаў сум мяне, як дым густы.
Ты так кахаў,
у працы
жыў... і раптам
Цябе няма...
Не прыдзеш болей ты...
Цябе няслі сябры.
Сінеў азёрны плёс.
І камісар палка йшоў за трунною
з намі.
Над возерам Хасан,
у сіняве нябёс
Сівыя хмары падалі дажджамі.
Аб смерці тэлеграма
з далёкіх рубяжоў
Прышла ў калгас,
залітая слязой...
Збіралі маткі
дарагіх сыноў
Туды, дзе ты забіт,
мой друг—герой.

Пераклад з рускай мовы
К. ЦІТОВА.

Алесь Бачыла

Л Ю Б Л Ю

З дзяўчатаў смелых не адна
Ты шчырая такая,
Цябе і раніца сама
Лагодна сустракае:
Шуміць паслушлівы станок,
І у працы яго шпаркай
Ты не адходзіш ні на крок,
Прыгожая ўладарка.
І рук тваіх вялікі спрыт
Шчасліўціць час і працу.
— Скажы, хто можа ў той парыў
З табою параўняцца?
Або вось гордал ляціш
У сінія прасторы...
Яны ў тваім цяпер жыцці
Аб радасці гавораць.
Яна прыходзіць і з табой
Гучыць у песні звонкай.
— Люблю цябе, таварыш мой,
Дзяўчына — комсамолка!
З дзяўчатаў смелых не адна
Ты шчырая такая,
Таму і раніца сама
Цябе так сустракае.



«Удвaіх»—скульптурная група работы настаўніка Смалявіцкай поўнай сярэдняй школы т. Мазо, прысвечаная XX ВЛКСМ. Фото В. Грунтфеста.

Пімен Панчанка

М А Ц Е Р Ы

Ад звонкіх песень, светлых дум,
Ад цішыні палеткаў мірных
Я зноў засмучаны прайду
Па сцежцы цяжкіх успамінаў.
Пра радасць хочацца спяваць,
І ўсё-ж забыць не маю сілы,
Як ты чужое жыта жаць
Са мной, малым, калісь хадзіла,
І ад відна і да відна
Гібела ты ў полі, маці,
Каб цяжкай працаю для нас
Нішчымны полудзень прыдбаці...
Ты помніш вечар?
Небасхіл
Дарэшты спален быў зарою,
На ўзмежку села ты без сіл,
Слязу ўціраючы рукою.
Ды непаслушная сляза
Расінкай капнула на шчаўе...
Шумела тонкая лаза,
Самотна кнігаўка крычала,
Каб разагнаць сваю тугу,
Ты песню ціха заспявала.
Я гэту песню берагу:
Яна ў сэрца мне запала.
Ты ў ёй жадала, каб я быў
Харобрым, статным і вучоным,
Красуню - дзеўчыну любіў,
Валодаў скарбам незлічоным.
Хацела, каб такім я стаў,
Ад сэрца зычыла мне шчасця...
Ды толькі ведала —
Чакаў
Мяне бізун, каб статак пасціць...
Я вырас.
І сягоння рад
Уславіць маладою песняй
Любімага правадыра:
Ен тваю мару, маці, здзейсніў.
Я ўсім багат! Я гаспадар
Палёў, лясоў, лугоў і рэчак.
Я атрымаў выдатны дар —
Правоў сапраўдных чалавечых.

Ліпень 1938 г.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАГА КОМСАМОЛА

Віцебскі Беларускі дзяржаўны тэатр у юбілейныя дні ленінскага комсамола пакажа п'есу Юрыя Свірына «Царэнцій Іванавіч». П'еса малюе гераічную барацьбу совецкага народа ў годы грамадзянскай вайны за незалежнасць сваёй вялікай радзімы.

Яшчэ ў 1920 годзе на Далёкім Усходзе совецкі народ даў рашучы адпор японскім інтэрвентам. Ідэя п'есы, аб тым, што совецкі народ ніколі не дасць японскім і іншым захватчыкам ні пядзі сваёй зямлі, гучыць актуальна, не гледзячы на тое, што яна напісана на матэрыялах 1920 года. Ставіць п'есу рэжысёр тэатра Ц. Н. Сяргейчык. У спектаклі заняты ўсе комсамольцы і ўся моладзь тэатра.

Больш палова работы над п'есай ужо праароблена. Адразу-ж пасля выпуску п'есы «Чалавек з ружжом» тэатр прыступіць да выпуску п'есы «Царэнцій Іванавіч», каб паказаць яе ў юбілейныя дні і прадэманстраваць у дні дваццацігоддзя ленінскага комсамола творчы рост сваіх маладых таленавітых акторскіх кадраў і сваёй, выхаванай тэатрам рэжысуры. **I.**

---o---

Дзяржфілармонія — да дваццацігоддзя ленінска-сталінскага комсамола

Калектывы Дзяржфілармоніі БССР дзейна рыхтуюцца да дваццатай гадавіны ленінска-сталінскага комсамола. Удзельнікі хора, сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў і ансамбля песні і танца бяруць на сябе абавязацельствы па падрыхтоўцы новых песень, танцаў, новых музычных твораў, прысвечаных гадавіне.

Найбольш значнай падзеяй у гэтай падрыхтоўцы з'явіцца работа сімфанічнага аркестра над новай сімфоніяй кампазітара Падкавырава, прысвечанай комсамолу. Апрача гэтай сімфоніі аркестр рыхтуе канцэрт з твораў маладых кампазітараў Багатырова, Крошнера і Падкавырава, а таксама пятую сімфонію Шастаковіча.

Ансамбль песні і танца філармоніі рыхтуецца да раду канцэртаў у рабочых клубах.

Значную ўвагу аддае філармонія абслугоўванню перыферыі. На працяглыя гастролі па раёнах выедуць хор, аркестр народных інструментаў і тры зборныя брыгады.

Апрача таго, будзе арганізаван рад канцэртаў для дзяцей сіламі маладых выканаўцаў. У прыватнасці, спецыяльныя канцэрты будуць дадзены сіламі комсамольцаў Маскоўскай кансерваторыі, комсамольцаў-выканаўцаў БССР і студэнтаў Менскага музычнага вучылішча. Апрача Мен[ск]а маладыя выканаўцы выступяць з к[ан]цэртамі на перыферыі.

---o---

ШТО ДАЛІ НАМ КУРСЫ

Што, уласна кажучы, далі нам курсы маладых аўтараў пры Праўленні ССП БССР?

Па-першае, курсы прывілі яшчэ большую любоў да літаратуры, да мастацкага слова, павысілі нам ідэйна-палітычны і культурны ўзровень, а па-другое — пазнаёмілі нас з дасюль мала знаёмымі нам відамі мастацтва, як напрыклад: операй і балетам.

Хачу сказаць аб драматургіі.

На курсах у нас быў толькі адзін драматург — тав. Юр'еў, астатнія, так сказаць, пасіўнічалі ў адносінах да гэтага жанра.

«Што драматургія? П'есу напісаць—дзесяць дзён, і гатова»—так гаварылі мы, будучы мала знаёмымі з драматургіяй. Але, калі нам было прачытана некалькі лекцый на гэтую тэму, мы зразумелі ўсю цяжкасць працы над гэтым складаным жанрам.

Усе, без выключэння, курсанты былі мала знаёмымі з іспанскай літаратурай, апрача Сервантэса. На курсах мы пазнаёміліся бліжэй, з літаратурнай спадчынай іспанскага народа.

Вось некалькі прыкладаў карысці курсаў, а гэта не ўсё. Курсы далі нам многа больш, чым я сказаў.

Трэба заўважыць, што лекцый пра прозу чыталася зусім мала, з літаратурай братніх рэспублік (апрача рускай) зусім не знаёмілі. Нас цікавяць пісьменнікі Барбюс, Ралан, Лондан, Гётэ, а пра іх не сказалі ні слова. За час курсаў не было праведзена ні аднаго вечара, дзе-б з чыткай сваіх твораў выступалі пачынаючыя.

Курсы трэба паўтарыць яшчэ раз, бо такія, здаецца, дробязі, як курсы, выклік пачынаючага на пленум, на творчы вечар натхняюць яго, нараджаюць новую энергію ў ім.

Анатоль ФІНКЕВІЧ.

Антон АЛЕШКА

ДУМА КАЗАКА

(Апавяданне)

Стэп... Гарачыня...

Сухі вецер дзьме з усходу. Сінь неба цьмяная ад пылу пазірае хмура. Ад спёкі пахавалася ўсё жывое, стэп маўчыць—ціха, нібы ў аграмадным склепе з блакітна-шэрым абечкам. На пыльнай дарозе каля балкі спыніліся распараныя валы.

Жывёла пазірае затуманеным вокам. вяла паводзіць шыяй пад важкім ярмом. Б'е па дышлу хвастом нібы цэпам. Абаперлася жанчына на білца калёс, бездапаможна глядзіць на нежывы твар мужа.

Перад апошнім словам з роту хлынула кроў і рукі здаравякі-казака дрыжача ўхапілі паветра, шукалі схапіцца за што-небудзь, каб зменшыць нязносныя пакуты.

Упала на білца правая рука, жылістая, густа аброслая.

Жанчына з хвіліну стаяла нерухома, а потым зразумела ўвесь сэнс таго, што адбылося, крыкнула дзікім голасам, які выказваў жах, і, абхапіўшы плечы мужа, загаласіла.

— Ой, саколік мой галубок... Мой Макарка... ды на каго-ж ты мяне пакінуў? А дзетачкі-ж твае драбней маку, дзе-ж ім пяцярым прытуліцца?..

Горка плача жанчына. У нямым забыцці пад высокім сонцам пячэцца стэп.

Што рабіць жанчыне?

Слёзы высахлі. Яна не плача, а толькі ўсхліпвае. Сударгава выпінаецца ўперад ніжняя скіўца. Умурзаны твар пачарнеў ад гора.

Жанчына завярнула валоў і ўсеўшыся на білца, пазірае на дарагія рысы твару.

Доўга цягнецца дарога. Скрыпяць калёсы.

Сонца добра звярнула за поўдзень і на дымчатым гарызонце пачаў вырысоўвацца хутар.

Праязджаючы каля шырокай высаджанай брамы Залеўскага, жанчына адвярнулася.

Ей не хацелася глядзець на бялявыя пакоі магната, на фігурную агароджу саду, квяцістыя газоны.

Яна зірнула ў сінь неба і скрозь сціснутыя зубы працадзіла:

— Каб не разжыўся... Гад!! Божа...

Валы сунуліся ў канцы хутара. З хаты высыпала сям'я. Двор запоўніўся плачам.

Кучкай стаялі, выпучыўшы жываты абадраныя дзеці. Большы хлапчук стаў на кола і, убачыўшы прыплюснутыя шкляныя вочы бацькі, яшчэ мацней закрычаў.

— Татачка...

Брату дапамаглі меншыя. Сабраліся суседзі і ўнеслі памёршага ў хату.

Да ночы чуўся плач у канцы хутара.

Назаўтра на вуліцы сустрэўся Залеўскі. Сыты твар яго нібы карова вылізала, гэтак ён блішчэў.

— Удава, зайдзі... Мушка мукі дасць на памінкі...

У гэты-ж год перуном траскучым разнеслася вестка аб вайне. З хутара выстрайваліся коннікі пасля малебна каля царквы.

Вуліца напоўнілася казачкамі.

Лілося мора слёз і прычытанняў.

А хутарскі атаман падганяў:

— Стройся!!

На водшыбе казак схіліўся з сядла і доўга суцяшаў жонку з гуртам дзяцей.

Пачуў голас атамана, паволі адапхнуў яе чэпкія рукі. Конь пайшоў ступою.

Яна ўхапілася за стрэмя, прасіла абліваючыся слязьмі.

— Ці хутка ты?

— Хутка...

Пагнаў каня казак. На поплаве, стоячы на каленах, засталася цяжарная жанчына.

Час спачатку цягнуўся марудна. Потым дні міналі хутка, а гады праходзілі днямі.

Вайна скончылася даўно.

Ад Макаравае сям'і застаўся самы меншы хлопчык. Жанчына без пары састарэла ад пакутнага жыцця. Астатнія вымерлі ад хвароб і нястачы.

Будучы ўжо немалым, хлапчук Макара пасвіў хутарскія каровы разам з Гараськам.

Аднойчы загналі чараду пад курганы і калі каровы палёгшы жавалі, Гараська пацірау потны лоб рукавом і старэчым голасам апавядаў.

— Ты ведаеш, Толя, ды не ўсё... Тады і сам я быў у млыне. Прывёз бацька твой тры вазы збожжа ад Залеўскага. І бядак не паспеў паловы мяхоў вынесці, як на лесках пад мехам зваліўся. Падарваўся... Што-ж, каб на тым часе, то можа яшчэ і адратавалі, а то Залеўскі нават каня не даў. На валах Макарка на палове дарогі сканаў, не дацягнуў да станіцы...

Вось як гэта было...

Толя слухае Гараську і абрывае куксаватымі пальцамі шырокі ліст малачаю.

— Што цяпер? Пра Залеўскага і гаворкі няма... Гэта-ж вазьмі, ад рэчкі, па Сухую гару ўсё было яго. Такая зямля, гэтулькі выгады... Не інакш і цяпер усё гэта яму сніцца... Памятаю я яго. Піў кроў беднякоў; не адно жыццё загубіў. І тата твой... Толя хоча ўявіць свайго бацьку па тым, як кажа Гараська. Усплывае вобраз перад вачыма: высокі чалавек з маленькімі вусікамі. Шырокія порткі з бакоў аблямоўвае чырвоны кант.

З-пад шапкі віхрыцца чорны чуб, гэткі пышны. А калі захацеў, каб даўжэй маячыў вобраз бацькі, то раптам заўважыў, што яму толькі здалося — гэта быў не бацька, а Анікееў Іван, у якога ён два гады батрачыў.

Ен рвануў за цівіну малачая, расцёр аб камень сцякаўшы малочны сок і паглядзеў на рэдкую бараду Гараські.

Ні разу не сказаў ён дарагога слова «тата» і ніколі не чуў ласкавага слова бацькі.

Расчулены апавяданнем Гараські, ён устаў і нібы трэба было агледзець чараду кароў, сказаў упоўголас, адвярнуўшыся:

— Тата...

За курганамі далёка ляжаў стэп.

Потым ужо Толя сам з сабою разважаючы дзівіўся, губячыся ў дагадках, чаму Анікееў Іван калісь гонячыся з папружкаю па сенажаці крычаў яму:

— Гэта табе не бацькаўшчына, што ты разваліўся. Сена грабі. Нажыві бацькаўшчыну, тады і адпачывай...

Здарылася так, што тады не вельмі ён цікавіўся гэтымі словамі, а гэта ўспомніў і запытацца хацеў-бы ў самога-ж Івана, ды няма яго. Раскулачылі. «Можа Іван лічыў сваю аграмадную сядзібу бацькаўшчынай?.. Але чаму ён яе адцураўся?» — разважае Толя.

«А дзе ў таты майго была бацькаўшчына?» — з затоенаю думкаю парашыў ён увечары спытацца ў мацеры.

Аднойчы маці вытлумачыла як магла.

Сын стаяў каля вушака ў сенцах, а ў мацеры на зморшчаным твары крыштальнаю расінкаю ўпалі слёзы.

— Не было, сынок, бацькаўшчыны. Была яна толькі ў багатых.

Прайшлі гады.

З няўдаліцы-падпаска вырас стройны хлопец.

З паднятым настроем пераступіў ён парог прызыўнога пункта.

Камісар пытаўся:

— Ваша прафесія?..

— Штурвальны камбайна комсамольскай брыгады...

Камісар пацікавіўся далей:

— Колькі ўбралі ў гэтую ўборачную?

— 1.500 га...

Яшчэ ў лепшым настроем вышаў Толік на вуліцу. Яго спаткалі сябры.

— Ну, як?

Усмешка знікла з твару і над вялікімі блакітнымі вачыма насупіліся камячкі брывей. На носе дробнай расою выступіў пот.

— Што як?

— Годзен ці не?..

Пушок на верхняй губе ўздрыгануў і Толік кінуў пытаўшаму з-за пляча:

— Я і ўчора ведаў, што буду годзен. Пытае...

Другі дадаў:

— Гэтакі казачына... Груда, а не чалавек. А ты пытаеш...

Толя паказаў белы рад зубоў і, пацёршы вялікія неадмытыя з мазуты рукі, весела сказаў:

— Паслужым... Дзе гарманіст?..

— На камісіі, — адказалі з ганку.

— Тады я ў райком загляну...

Высокая постаць Толі, туга абцягнутая шэрым касцюмам, знікла на вуліцы.

Прайшоў год.

Толя нацягнуў на галаву капішон маскіровачнага халата, адхіліў сцебялькі травы пад кустом. Потым прапоўз уперад і прыслухаўся.

Манатонна гамоніць лес.

Недзе недалёка галасна крычыць сава.

Наперадзе маладзенькія кусцікі густа пусцілі лісце. Толя прасунуўся да іх, адхіліўшы кудлатую галіну бярозкі, паглядзеў. Пацягнула халадком.

Побач плюхае ў берагі шырокае плёса рэчкі.

Той бераг цямніцца сінявою лесу.

На пяску берага звіўся гад.

Луска ўздоўж гнуткага цела пераліваецца халоднымі колерамі.

Толя стаў на калены і астрыём штыха прыціснуў галаву гада. Ен порстка закруціў хвастом навакол ствала вінтоўкі. Потым упаў веравучынай...

Праз секунду яшчэ з большай сілай стала звівацца яго цела, падымаючыся ўверх.

Безгучна марсканў гад, ударыў халодным хвастом па руцэ Толі.

Толя капнуў штыхом уперад.

На сонцы засвяцілася каляровая спіна гада, ён плюхнуў у раку. Кульнуўся некалькі разоў на паверхні, хвалі ўдарылі ў бераг і панеслі далей, у вір.

Толя выглянуў з-за куста.

Бурная плынь рэчкі ўлева разлілася на два рукавы. Між імі — востраў.

З-пад камячкоў брывей пазіраюць пры́ткія вочы, край капішона павіс над вухам. Аднастайна шэпчуць верхавіны лесу.

Толя прылёг на жывот, глядзіць уніз плыні рэчкі, туды, дзе відзён другі край вострава.

Ен расхільвае кусты, аглядае бераг управа.

Усё спакойна.

Непрыкметна плыве час.

Толя ўзлёг на локаць і пачуў, як у кішэнцы зашамацела папера. Успомніў пра ліст. Выняў лісток паперы. Любоўна паглядзеў на радкі нязграбных літар.

«І яшчэ паведамляю табе, мой сын, што на тым тыдні была ў нас цётка Ульяна. Казала, што іх Сямён хоча служыць на граніцы. Ен увосень прызываецца. Гаспадарка наша пакрысе прыбывае. Апрача каровы я маю яшчэ цялушку. У яе ўжо адраслі рожкі і яна штодзень бычыцца і бушуе з падстрэшшам прыгрэбіцы. На лета карову аддам калгасу, бо старая ўжо.

Вясною калгас адрамантаваў хату Анікеева Івана і аддаў мне.

Сынок, калі прыедзеш дамоў, не пазнаеш, дзе мы жывом. Гэты год у нас вельмі добры ўраджай. Жыта за могілкамі такое, што я колькі жыву не бачыла. Ну, чарот, а не жыта. А вышыня, а колас той, як гарапнік.

Я хоць на старасці год дачакалася сапраўднай бацькаўшчыны, а тата-нябожчык так і памёр на чужыне.

Служы, сынок, верна і пільна ахоўвай граніцу.

Твая маці».

Толя злажыў лісток, успомніў пра калгас. Яму неяк цяпер і ніякавата, што ён пытаўся ў маці пра бацькаўшчыну. Але што? Тады ён быў хутарскі падпасіч.

Ен яшчэ глядзіць на шэрыя хвалі рэчкі, на бераг вострава.

На бязвусым загарэлым твары расплываецца ўсмешка ад успамінаў. Ен разважае:

«Бацькаўшычна... Дзе мая бацькаўшчына?.. Вось яна: ляжыць ад гэтага далёкаўсходняга берага туды, на захад, на тысячы кіламетраў і канчаецца ўраджайнымі калгаснымі палеткамі Беларусі. А глянь на поўнач, на поўдзень! Якая шыр, колькі багацця! За такую бацькаўшчыну дзякуй таварышу Сталіну!»

Толя сціскае халоднае дула вінтоўкі і з любоўю шэпча гэтае дарагое імя. пільна ўзіраецца ў варожы бераг. Над рэчкай, у вышыні, павіс шэры купчасты воблак. Сонца губіцца ў зубчатай зелені далёкага лесу. «А бацька... Хто мой бацька?.. — думае ён далей.— Мой бацька самы геніяльны на свеце чалавек, які даў шчаслівае жыццё мільёнам абяздоленых, такіх, як і я; імя яму — Сталін».

Трапечацца лісцік на галінцы.

На твар Толі ўпалі прамені, асвяцілі яго прыгожыя быстрыя вочы, нос крыху прыплюснуты, і чорную радзінку на верхняй губе.

Вялікія рукі крэпка трымаюць лёгкае цела сяброўкі-вінтоўкі.

Над востравам працягнулася сіняя плёнка адвячорка. Той бераг стаў знікаць з гарызонту за ценькай шэрай паласою.

Толя расхільвае кусты, каб адразу былі відаць рэчка, востраў і туманная далеч берага.

Раптам пачуўся гул.

Толя спачатку падумаў, што здалося, потым шчыльна лёг на зямлю, прыслухаўся.

— Не, недзе гудзе...

Ен паглядзеў у сінь неба, потым у далечы рэчкі зачапіла вока чорную кропку. За ёю паказалася другая.

Ен ужо выразна бачыць дзве лодкі, чуе лопат матораў, якія разлятаецца па рацэ.

Лодкі крута завярнулі і прычалілі да вострава. Толя здаецца ўрос у зямлю.

Навакол ні гуку не чуе, — гэтак пільна ён уставіўся на бераг вострава. Рука да хрусту ў пальцах сціснула ложа вінтоўкі.

Ен нячутна падаўся назад, адпоўз за суседнія кусты, прыгнуўся і пабег.

— Таварыш Зенчык, бягом на заставу. На нашым востраве высаджваецца японa-манчжурская банда з двух маторных лодак. Я застаюся назіраць...

З прыгожага арэхавага куста выскачыў баец і паўтарыўшы загад старшага па нараду, знік.

Толя вярнуўся назад і прыліпшы да берага, сочыць, што робіцца на востраве.

Японa-манчжуры высадзіліся на бераг. Два апошніх нешта вынеслі на плячах. Не разабраць было.

Лодкі лапанулі маторамі і прапалі ў шэрані адвячорка.

Толя не зводзіць погляду з таго месца, дзе высадзіліся, назірае, што будзе далей.

З заставы прыбыў нарад. Толя далажыў што бачыў. Лейтэнант у бінокль праглядаў бераг вострава. Астатнія чакалі загаду.

Неўзабаве паказаўся наш старажавы кацер. Калі толькі ён параўняўся з востравам, адтуль далі залп.

— Таварыш лейтэнант, дазвольце мне з Дзехцярова пастрачыць ворага? — шэптам прасіў Толя.

— Дазваляю...

Лейтэнант па дымках з вострава адразу адзначыў месца, дзе заселі японa-манчжуры, і падаў каманду.

Два ручныя кулямёты дружна секанулі па востраву. Толя моцна прыціскае да пляча прыклад кулямёта, не міргаючы вядзе агонь.

Наш кацер развярнуўся і ўзяў курс на востраў. Над алавянай плынню рэчкі павіс сіні дым. Бераг гулка гамоніць рэхам.

На попельным плёсе неба цьмяна заіскрыліся зоркі. Стала ціха.

Да берага прычаліў кацер і камандзір яго адрапартаваў лейтэнанту:

— Таварыш лейтэнант, чатыры ўзята ў палон, двое забіта. Востраў ачышчаны. На кацеры ўсё ў парадку.

Далей камандзір пералічаў трафеі, узятыя ў японa-манчжурскіх валак.

МОЛАДЗЬ У МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У калектыўнай дружнай працы
Самі песні тварацца,
У нас весела жывецца
І работа спорыцца.
(З народнай творчасці).

Побач з буйным ростам прафесіянальнага мастацтва БССР, расце і квітнее народная творчасць і мастацкая самадзейнасць. На кожнай фабрыцы, на кожным заводзе, у калгасе соўгасе і МТС арганізаваны гурткі мастацкай самадзейнасці. Такіх гурткоў тысячы. Па далёка няпоўных даных, яны яднаюць каля 50 тысяч чалавек усіх узростаў. З гэтай колькасці прыблізна 60 процантаў складае моладзь ва ўзросце ад 17 да 26 год.

Наша савецкая моладзь з'яўляецца асноўнай арганізуючай сілай ва ўсіх гуртках мастацкай самадзейнасці. Моладзь дае вялікую колькасць таленавітых танцораў, спевакоў, актораў, мастакоў, скульптараў, вышывальшчыц, ткачых і т. д. Сярод кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці звыш 500 чалавек—моладзь. Яны сапраўдныя энтузіясты самадзейнасці, якія любяць мастацтва, бо мастацтва дае ім магчымасць найбольш ярка, вобразна выказаць свае пачуцці радасці, патрыятызма, адданасці любімай радзіме, камуністычнай партыі і вялікаму Сталіну.

Працоўныя БССР добра ведаюць такія гурткі мастацкай самадзейнасці, як гурток Хойніцкай МТС, якім кіруе тав. Лявіцкі — малады таленавіты арганізатар, які здолеў стварыць высокамастацкі калектыў, атрымаў вельмі добрую ацэнку на алімпіядах у Менску і ў Маскве.

Добры харавы калектыў Прыбыткоўскага сельсовета, Гомельскага раёна, складаецца ў асноўным з моладзі. Кіруе ім таксама малады настаўнік тав. Пятрэнка.

Танцавальным і харавым калектывамі промкааперацыі ў Шклове кіруе таленавітая маладая энтузіястка тав. Карповіч.

У віцебскім клубе промкааперацыі танцавальным калектывам, які цалкам складаецца з моладзі, кіруе малады камсамолец тав. Партноў, і т. д.

Нам вядомы дзесяткі і сотні імён лепшых выканаўцаў — маладых энтузіястаў мастацкай самадзейнасці, якія ўвесь свой вольны ад работы на вытворчасці час, аддаюць любімай справе. Вось вядомы ў Гомелі выканаўца беларускіх і яўрэйскіх народных песень тав. Папова, чатырнаццацігадовая спявачка Барысава тав. Чэрток, якая сама сабе акампаніруе на гітары, таленавіты актор менскага клуба медсанпрацы тав. Слепян і т. д.

Наша моладзь падыходзіць да мастацкай самадзейнасці не павярхоўна. Яна любіць сваю справу і імкнецца да павышэння сваіх мастацкіх ведаў. На завочных курсах Усесаюзнага Дома народнай творчасці імя Крупскай у Маскве дваццаць тры маладыя работнікі мастацкай самадзейнасці БССР вывучаюць музычную грамату. 150 заяў ад маладых кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці атрымаў Дом народнай творчасці БССР—аб залічэнні іх на трохмесячныя курсы. Менскае тэатральнае вучылішча амаль цалкам укамплектована лепшымі маладымі прадстаўнікамі мастацкай самадзейнасці. Шмат пісьмаў атрымлівае штодня Дом народнай творчасці БССР ад маладых кіраўнікоў гурткамі мастацкай самадзейнасці. У гэтых пісьмах яны звяртаюцца за парадамі і кансультацыяй.

А каму невядомы маладыя мастакі, работы якіх атрымалі высокую ацэнку на Першай усебеларускай выстаўцы народнай творчасці. Вось імёны некаторых з іх: тав. Каўшэўны з Рэчыцы, які стварыў шмат высокамастацкіх карцін і партрэтаў з рознаколерных запалак, тав. Бураў — малодшы камандзір, які ганаровую службу ў Чырвонай Арміі спалучае з мастацкай творчасцю (ён напісаў карціну «Адпачынак чырвонаармейца ў калгасе» і зараз да дваццатай гадавіны ленінска-сталінскага камсамола працуе над карцінай «Бой 27 дывізіі на Бярэзіне»); малады настаўнік тав. Сержантаў, які напісаў карціну «Едуць на выбары»; малады скульптар тав. Мазо, які зрабіў мастацкую скульптуру «Удваіх»; чырвонаармеец тав. Івінскі— высокамастацкі рэзчык па дрэву і інш.

На ўсебеларускай выстаўцы народнай творчасці было таксама прадстаўлена шмат ткацкіх і вышывальных работ, зробленых рукамі маладых вышывальшчыц тт. Параскі Канявега, Марыі Скалабавай, Ірыны Касяецкай, Ольгі Кецко, Анны Гук, Самусенка, Каўбаса і інш. Усе гэтыя таварышы працуюць у вольны ад работы ў калгасе час, імкнучыся ў сваёй творчасці адлюстраваць новую сучасную тэматыку.



ПЕРШАГА ВЕРАСНЯ ПАЧАЎСЯ НОВЫ ВУЧЭБНЫ ГОД.

На здымку: Вучні другой менскай няпоўнай сярэдняй школы ў першы дзень вучобы каля сваё школы.

Цяжка пералічыць у кароткім артыкуле ўсё высокакаштоўнае і высокамастацкае, што маем у творчасці нашай савецкай, шчаслівай моладзі. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла небывалыя магчымасці для ўсяго савецкага народа, для ўсёй моладзі — разгарнуць усе свае здольнасці на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку на фронце мастацтва і мастацкай самадзейнасці.

З вялікім энтузіязмам рыхтуецца наша савецкая моладзь — удзельнікі мастацкай самадзейнасці — да XX гадавіны ленінска-сталінскага комсамола. Кожны гурток рыхтуе свае падарункі да выдатнай гадавіны. Гэтыя падарункі яны пакажуць перад усёй краінай на трэцяй усебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці і другой усебеларускай выстаўцы народнай творчасці, прысвечаных XX-годдзю ленінска-сталінскага комсамола.

Тэматычны змест гэтых падарункаў—карцін, скульптур, вышывак і т. д. — сведчыць не толькі аб буйным росце мастацкіх здольнасцяў нашай моладзі; яны сведчаць таксама аб высокай палітычнай актыўнасці, аб савецкім патрыятызме, аб жаданні паказаць у мастацкіх вобразах усю сілу і магутнасць нашага народа і гатоўнасць у любы момант даць рашучы адпор ворагу, калі ён паспрабуе сунуць сваё свіное рыла ў наш савецкі агарод.

Вораг дзесьці робіць планы
Хоча з намі ваяваць.
Ну! Дык знай, буржуй паганы —
Супроць нас не устаяць.
Не адняць, што ў нас здабыта
За савецкія гады.
Толькі скажа Варашылаў —
Мы гатовы заўсягды.
Многа зорачак на небе —
Адна зорачка ясней.
Многа ёсць дзяржаў на свеце —
СССР за ўсіх ясней.
(З народнай творчасці).

М. БЕЙЛІНАЎ.

А. Бурдзель

ЧАЛАВЕК і ЗЯРНО

Тугое, спелае зярно
На дол апала;
Як заўсёды,
Жыццём напоўнена яно,
Вялікай сілаю прыроды.

Пад залатою шкарлупой
Таіцца ўпартае карэнне,
Што ў нетры вільгаці зямной
Праб'ецца нават
праз каменне.

І стане кволае сцябло
Мацнець,
у вышыню цягнуцца...
Урэшце —
сонечным цяплом
Плады ружовыя нальюцца.

Мо' не за тыдзень, дык за год.
А прарасце зярно-зародак,
Яго не знішчыць жорсткі бот,
Ні буры град,
ні твань балота, —

Бо, што карыснага жыве
Пад гэтым небам на планеце —
Усё заклікаў чалавек
Расці,
Служыць вялікай мэце...

Таварыш мой!
няўтомна жыць
Пачаў ты ў замыслах любімых,
Што думаеш ператварыць
У славу і дабро радзімы;
твары!
табе няма граніц.
Скажы упэўнена ты: —
буду!

Праб'юся ў нетры таямніц
Там нездабытае — здабуду!
І смела мкніся
наш герой
Няхай табе у прыклад будзе
Адвага;
працаю сваёй
Ты пераможаш,
ты забудзеш;

Бо сярод нас усіх
жыве
Натхніцель подвігаў шчаслівых.
Таму ўзрастае чалавек
Ва ўсёй красе
на нашых нівах.

Першая Ўсесаюзная спартакіяда работнікаў мастацтваў

Па рашэнню ЦК профсаюза работнікаў мастацтваў быў праведзен агляд фізкультурнай падрыхтоўкі сярод работнікаў мастацтваў.

Сустрэча спартыўных таварыстваў «Мастацтва» і больш маладых фізкультурных калектываў нацыянальных рэспублік была ўпершыню так шырока ажыццёўлена на Першай усесаюзнай спартакіядзе ЦК работнікаў мастацтваў па лёгкай атлётыцы і плаванню ў г. Кіеве.

Побач з мацнейшымі фізкультурнікамі Масквы і Ленінграда, таварыства «Мастацтва», былі калектывы гарадоў Кіева, Харкава, Менска, Свердлоўска, Одэсы, Растова, Калініна, Варонежа, Грузінскай ССР, Чувашскай АССР, Марыйскай АССР.

Трохдзённыя спаборніцтвы з 23—25 жніўня вызначылі падрыхтаванасць каманд.

У першую групу былі вылучаны калектывы Масквы і Ленінграда. Па другой групе першыя месцы заваявалі Чувашская АССР, Харкаў, Кіеў. На чацвертае месца вышаў беларускі калектыў.

Для ўдзелу ў спаборніцтве ад Менска выехала 8 лёгкаатлётаў і 2 плаўцы—работнікі Тэатра оперы і балета.

Большасць каманды складалася з салістаў балета і прыма-балерыны тав. Нікалаевай, якая, не гледзячы на вялікую нагрузку па вытворчасці, здолела сумясціць яе з актыўным удзелам у падрыхтоўцы да ўсесаюзнай спартакіяды.

Паказалі надрэнныя рэзультаты і занялі першае месца па II групе Шчолкіна (прыжкі ў вышыню). і Пекур (прыжкі ў даўжыню).

Усесаюзнае спаборніцтва пакінула ў нашым калектыве раднасае ўражанне, а таксама пераканала нас у неабходнасці сур'ёзнай і сістэматычнай падрыхтоўкі да прадстаячага спаборніцтва па валейболу і тэнісу.

І. ГУРЭЦКІ—
удзельнік каманды.



ПРЫЗЫЎ У РСЧА І ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ.

На здымку: Прызыўнікі ў час адпачынку ў ваенна-марскім лагеры Асоавіяхіма пад Масквой. (СФ).

І. С. ТУРГЕНЕЎ

(ДА 55-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ)

3 верасня 1883 года ў Бужывале (Францыя) памёр вялікі майстар слова, — пісьменнік Іван Сяргеевіч Тургенеў.

Легенда аб апалітычнасці, бясстраснай беспартыйнасці, беспрынцыпным аб'ектывізме Тургенева з'яўляецца паклёпам на вялікага раманіста. Тургенеў быў афярай спецыфічных умоў класавай барацьбы ў Расіі, афярай трусасці расійскага лібералізма і змрочнасці той эпохі «безвременья», калі падводзіліся вынікі яго жыцця і дзейнасці. Уся супольнасць фактаў, вядомых, зафіксіраваных у гістарычных дакументах і ў творчасці пісьменніка, супярэчыць гэтай легендзе.

Людзі, якія стараліся замацаваць за Тургеневым уласцівасць апалітычнасці і беспартыйнасці, маглі, вядома, знайсці сабе падтрымку ў заявах самога пісьменніка: «Палітычнай іскры, на жаль, ва мне няма» — пісаў ён П. В.



І. С. ТУРГЕНЕЎ.

Перарысоўка з фото Н. Гурло.

Аненкаву ў 1862 годзе. — Але нават гэтая змякчоная заява пісьменніка не адпавядае рэчаіснасці: «палітычнай іскрай», гэта значыць, баявым тэмпераментам, палітычным чуццём, уменнем улічваць палітычную сітуацыю, уменнем манеўрыраваць і выбіраць пазіцыю ў адпаведнасці са сваёй палітычнай праграмай — Тургенеў валодаў не горш, чым многія прызнаныя палітыкі-прафесіяналы, яго сучаснікі.

Тургенеў быў і спеваком, і барацьбітом аднаго, зусім пэўнага стану, пэўнага класа, — і калі часам вёў спрэчкі з «абодвума бакамі» — і са сваім класам, і з варожым яму — дык не ў аднолькавай меры і не па адных і тых-жа пытаннях. Разам са сваім класам перажываў ён яго гістарычную эволюцыю і разам з ім змяняў шлях, калі таго патрабаваў няўмольны ход гістарычнага развіцця.

Аўтар твораў «Отцы и дети» і «Дым» быў палітычным дзеячом і палітычным мысліцелем задоўга да паяўлення «Рудина», — яшчэ тады, калі ён арганізаваў грамадскую думку ліберальных памешчыкаў, прыхільнікаў неадкладнай сялянскай рэформы, выхоўваючы ліберальную думку вобразамі «Записок охотника».

У «Записках охотника» яркімі мастацкімі фарбамі вялікі майстар слова паказаў карціну цяжкага жыцця рускай вёскі. Чытаючы «Записки охотника», ты праходзіш па задушанай прыгонам абяздоленай краіне.

Забітыя, бяспраўныя сяляне, скаваныя ланцугамі рабства, паказаны Тургеневым як людзі з вялікай благароднай душой, у якіх чалавечнасці больш, чым у іх гаспадароў-самадураў. Да такіх вобразаў належаць Лукер'я, Касьян, Каліныч і інш. Побач з благародствам гэтых людзей вельмі ярка выведзены тыпы самадураў-прыгоннікаў, якія супрацьпастаўлены вобразам сялян.

Тургенеў не быў такім дэмакратам і змагаром, якімі былі Чэрнышэўскі, Добралюбаў і Некрасаў. Ён нікога не заклікаў да барацьбы з самадзяржаўна-прыгонніцкім ладам. Ён пратэставаў толькі як дваранін-гуманіст. Але нават і гэты ліберальны пратэст Тургенева выклікаў адказныя рэпрэсіі з боку цара-жандара Нікалая І, і Тургенеў быў пасаджаны ў турму і высланы.

Тургенеў быў рэаліст і бачыў прыход новых соцыяльных слаёў у тагочаснай рускай рэчаіснасці. Вялікі мастак-рэаліст Тургенеў зразумеў, што родны яго клас — дваранства сябе гістарычна вычарпаў.

Адсюль і дружба яго з рэвалюцыянерамі-сямідзесятнікамі, адсюль і яго мастацкая цікавасць да такіх герояў, як Базараў, Нежданаў, Інсараў і інш.

Тургенеў не мог не пракланяцца перад гераічным пакаленнем рэвалюцыянераў-сямідзесятнікаў. Але ўся гэтая справа была для яго неяк з боку, без веры ў справу, за якую змагаліся Базаравы і Нежданавы.

А. М. Горкі ўказваў, што Рудзін — «гэта жывы твар эпохі» і падкрэсліў тую «надзвычай добрую спадчыну», якую пакінуў Тургенеў.

Ноткі глыбокага шопенгаўэраўскага песімізма чуюцца ў Тургенева не толькі ў такіх рэчах, як «Довольно», «Призраки», «Собаки» и т. д. Яны складаюць лейтматыў усёй тургенеўскай творчасці. Душэўныя катастрофы, разбітае жыццё праходзяць праз такія яго шэдэўры, як «Вешние воды», «Дворянское гнездо», «Стихотворения в прозе» і інш.

Тургенеў — родапачынальнік цэлай паласы так званага «дваранскага мінору». Ён першы востра адчуў уміранне дваранства. І як ні намагаўся ён рысаваць у тонах асуджанасці лёс рэвалюцыянераў — «новых людзей», аднак праўдзівасць мастака часта заблытвала яго замыслы.

Герцэн у сваіх артыкулах аб Базараве пісаў: «Тургенеў вывеў Базарава не для таго, каб пагладзіць па галоўцы — гэта ясна. Што ён хацеў штосьці зрабіць на карысць бацькоў, — і гэта ясна. Але ў датыканні з такімі вартымі жалю і нікчэмнымі бацькамі, як Кірсанавы, круты Базараў захапіў Тургенева і замест таго, каб пасекчы сына, ён выпараў бацькоў. Таму і выйшла, што частка маладога пакалення пазнала сябе ў Базараву.

Тургенеў быў больш мастак у сваім рамане, чым думаюць, і таму збіўся з дарогі, і, па мойму, вельмі добра зрабіў, — ішоў у пакой, папаў у другі, затое лепшы».

Глыбокую цікавасць, якую заўсёды праяўляў Тургенеў да роднай краіны і роднага народу, робяць яго, не гледзячы на яго абмежаваны дваранскі лібералізм, пісьменнікам глыбока народным. Нездарма Белінскі пісаў: «Тургенеў зайшоў да народа з такога боку, з якога да яго яшчэ ніхто не заходзіў; з якім удзелам і добрадушнасцю аўтар апісвае нам сваіх герояў, як умее прымусіць палюбіць іх ад усяе душы!».

К. Ц.

НОВЫ АТРАД МАСТАКОЎ-НАСТАЎНІКАЎ

Віцебскае мастацкае вучылішча выпусціла ўвесну 44 маладых мастакоў—педагогаў і работнікаў тэатра. Зараз выпускнікі размеркаваны па прадпрыемствах. 40 мастакоў атрымалі пуцёўкі ў школы на пасады педагогаў па маляванню, чацвёра прынята ў тэатр оперы і балета.

ПАПАЎНЕННЕ АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ТАНЦА

У пачатку ліпеня Дзяржаўная філармонія БССР абвясціла прыём новых удзельнікаў ансамбля песні і танца.

У адказ філармонія атрымала некалькі сот пісем калгаснікаў, калгасніц, рабочых і служачых. У рад раёнаў для азнаямлення з кандыдатамі і для выяўлення новых выехалі работнікі ансамбля. У выніку—адабрана група маладых найбольш здольных спевакоў і танцораў. Першыя дванаццаць чалавек прыняты на работу. Сярод іх—маладыя калгасніцы Касцюковіцкага, Любаньскага, Віцебскага, Смалявіцкага і іншых раёнаў.

Добрае пачынанне

(АЛЬМАНАХ РУСКАЙ СЕКЦЫІ ССП БССР)

Руская секцыя пісьменнікаў БССР, пасля доўгай бяздзейнасці, выдала альманах. Ён амаль цалкам прысвечаны абаронным тэмам і таму асабліва каштоўны. Чытач, не гледзячы на істотныя перапрацоўкі асобных твораў, знойдзе тут шмат цікавага і хвалюючага.

Проза альманаха адкрываецца эпізодамі-ўрыўкамі з 2-й кнігі Ів. Шапавалава «Большевики границы». Адчуваецца, што аўтар твору добра ведае жыццё ў прыгранічнай паласе і ўзяў жыццёвыя падзеі ва ўсёй іх суровасці. Чытач бачыць, якой упартай барацьбой напоўнены гераічныя будні савецкіх пагранічнікаў і як наш народ цесна звязаны з Чырвонай Арміяй, як любіць ён сваю радзіму і абараняе яе ад ворагаў. Да калгасніка Грыгора ўначы прыйшоў шпіён, патрабуючы схаваць яго ад пагранічнікаў. Грыгор, рызыкуючы жыццём свае сям'і, паведамляе аб парушальніку граніцы на заставу. За гэта бандыт забівае дзесяцігадовую дачку Грыгора—Фросю. Грыгор раніць бандыта. У гэтым эпізодзе паказан шпіён-звер, які для дасягнення сваіх брудных мэт не спыняецца ні перад чым. Для яго не існуе чалавечага пачуцця, яму незнаёма пачуццё сям'і і кахання. На пытанне начальніка заставы:

— Вы забілі дзіця. Як гэта?.. Ну, з пункту гледжання афіцэрскай этыкі?— Бандыт нахабна адказвае:

— Забіў дзіця, гаворыце? Аднаго? Як я гляджу на гэта? Хе! Шкадую, пан начальнік, што толькі аднаго.

У чытача гэты вобраз выклікае нянавісць і праклянцце да ворагаў. Аўтару ўдался і доўгі эпізод аб тым, як пагранатрад, не спілючы трох начэй сачыў за дыверсійнай бандай Макася і нарэшце, калі тая перайшла граніцу, вылавіў яе. Тут паказана мужнасць і вытрымка камандзіраў і чырвонаармейцаў, добра ведаючых сваю справу, адданых сыноў свае радзімы. Нажаль, мастацкія сродкі не заўсёды на вышыні патрабаванняў савецкай літаратуры. Эпізоды часам хвалююць не глыбінёй раскрыцця пачуццяў і думак герояў, а проста як расказанае здарэнне, як паведамлены факт. Так, у вобразе Грыгора не адчуваецца жывога чалавека. Шпіён забіў яго дачку. У час пахавання яе Грыгор маўчыць і невядома, якія пачуцці і думкі займаюць і хвалююць яго ў гэты цяжкі для яго час. Апроч таго, што Грыгор пасівеў, аўтар пра яго не здолеў нічога больш сказаць.

Аўтару лепш удаецца апісанне і дрэнна выходзяць месцы, патрабуючыя абагульненняў і думак. Часам аўтар захапляецца прымітыўным і надакучлівым тлумачэннем таго, што чытачу зразумела і так. Шапавалаву на ўсё гэта трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу. Часам у яго сустракаюцца недапрацоўкі і неахайнасці стылю:

«Трехлетний брат убитой, который остаток дороги **проделал на руках** у Игнатьева, выскользнул из его рук..» ці: «..Потянулись в направлении **звука свистка** бойцы».

Альбо яшчэ: «Людям хотелось сразу, пока не закрылась душа, сказать, о том, что породнило в ней пение, и они короткими, торопливыми фразами, полушопотом **делали это**».

Апошні эпізод з кнігі—апавяданне аб нейкай жанчыне Аўдзюшы, якую былое жыццё зрабіла амаль прастытуткай, а цяпер яна просіць начальніка заставы, каб ён паслаў яе на вучобу ў горад. Калі аўтар хацеў на гэтым факце паказаць Чырвоную Армію як культурную сілу, то матэрыял для выражэння ідэі ўведзены, па меншай меры, няўдала. Наша Чырвоная Армія сапраўды з'яўляецца культурнай школай і для чырвонаармейцаў і для акружаючых і блізкіх людзей, і для раскрыцця гэтай ідэі можна было выбраць больш удачны матэрыял. Чытачу з расказанага эпізоду незразумела, у якіх адносінах знаходзіцца начальнік з Аўдзюшай, чаму яна, сустрэўшыся з ім, пачынае адразу апавядаць пра сваё былое парочнае жыццё. Незразумела таксама, чаму яна апынулася на граніцы. Можа гэты эпізод у рамане адыгрывае якую-небудзь ролю і мае большую арганічнасць, але сам па сабе ён не мае самастойнага значэння і ў альманаху гучыць, як непатрэбны.

Пісьменнік Глазырын у апавяданні «Канец Пагоды» даў гісторыю паштовага ліхача-фурмана, які славіўся тым, што ўмеў пракаціць начальства. Калі ён пачуў—праз іх мясцовасць праводзіцца чыгунка—занепакоіўся (ён можа аказацца беспрацоўным) і асцярожна выпытваў аб гэтых чыгунках у праязджаючых. Пабудове перашкодзіла імперыялістычная вайна. Пры савецкай уладзе Пагоду прызначаюць начальнікам будаўнічага ўчастка. Пры акупацыі белымі гэтай мясцовасці Пагодзе даецца баявое заданне — з атрадам чырвонаармейцаў уберагчы важны стратэгічны пункт ад узрыву—мост. На гэтым пасту Пагода геройска паміраё. Імем яго названа цяпер чыгуначная станцыя.

Можна гаварыць аб рыхласці кампазіцыі,—часовая расцягненасць аўтару стварыла свае цяжкасці. Але ўсё гэта не перашкаджае добраму ўражанню ад апавядання. У ім пісьменнік выявіў добрыя якасці. Ён умее перадаць пэўную сітуацыю, ярка паказаць псіхалогію героя. Умее асвятліць унутранае жыццё сваіх герояў, даць індывідуалізаваную іх мову. Стыль апавядання—лірычны, крышку пявучы ад перанясення дзеясловаў і прыметнікаў на канец сказа. Ад яго апавяданняў вее мяккай цеплынёй. У такім-жа псіхалагічным плане напісана і другое яго цікавае апавяданне—«Два пятака».

Яшчэ з прозы ў альманаху змешчаны два апавяданні Ефіма Садоўскага: «Макар Чубов» і «Молчание». На першым з іх ляжыць адбітак карыснасці. Адчуваецца няўменне абыходзіцца з матэрыяламі — біяграфічная паслядоўнасць, непатрэбныя дэталі—стрымліваюць аўтара. Садоўскі правёў свайго героя праз рад падзей, між якіх ёсць і яркія эпізоды (смерць маці, здрада каханай дзяўчыны, пра якую Макар марыў тры гады на фронце). Але Садоўскі не ўскрыў, як усе гэтыя факты і падзеі ўздзейнічалі на фарміраванне Макара з простага, забітага салдата ў свядомага рэвалюцыянера. Гэта павінна было стаць асновай апавядання, на справе-ж атрымалася апісанне падзей.

Значна вышэй па мастацкіх якасцях стаіць яго апавяданне «Молчание». Тут дадзена чуллівая гісторыя Аўгуста Вайшыя — аўстрыйскага рэвалюцыянера, які ўцёк з турмы і пераехаў жыць у Савецкі Саюз. Нямы і глухі (след турэмных катаванняў), ён працуе цяпер у абсерваторыі, даючы зводкі аб надвор'і для палётаў самалётаў. Ён, таленавіты чалавек, цалкам захоплены сваёй работай. За гэта ўсе яго любяць і паважаюць. У Савецкім Саюзе ён знайшоў сваю радзіму, але знявечанаму, яму цяжка жыць кіпучым, дынамічным жыццём. Ён прымушаны «маўчаць». На гэтым трагізме зроблена моцная сцэна размовы з ім дзяўчыны-лётчыцы, якая прыйшла к яму за зводкамі і злуецца, што Аўгуст не адказвае на яе запытанне. Потым, пазней, гэтая-ж дзяўчына вязе яго ў Маскву на самалёце на аперацыю да прафесара. Ідэя гэтага апавядання, клопаты і цеплыня, якімі акружаны ў Савецкім Саюзе людзі, — выражаны ярка і хвалююча. Матэрыял, на якім выражаецца гэта ідэя, вельмі цікавы.

Вершы, змешчаныя ў альманаху — заметна слабей за прозу. Ів. Шапавалаў мае значна большыя дасягненні ў прозе чым у паэзіі. Вершы яго не канкрэтныя, рытарычныя.

Жаданне сказаць квяцістей прыводзіць і Н. Дудзіна да бяссэнсіцы. Так у вершы «Пейзаж» — чытаем:

«Со смены сюда подойдет молодежь,
На озеро выйдут байдарки
И будет подарком веселый галдежь
К рисунку с окраскою яркой».

Верш К. Цітова «Партызан Кожух»— заганны ў сваім сэнсе, надуманасць сюжэта, да таго-ж яшчэ і небагатыя мастацкія сродкі робяць яго нецікавым. Атрад чырвоных змагаецца з бандай Шугая. У чырвоных вышлі ўсе патроны. Тады яны садзяцца з дубцамі за прыдарожныя дрэвы і перабіваюць усю банду і атамана забіраюць у палон. Так сказаць, «прышоў, убачыў і перамог». Бой у Цітова падобны на гульню ў гарадкі.

Лепшы з усіх вершаў верш Васілеўскага «Он будет жить», аб смерці Сяргея Міронавіча Кірава. Аўтар паказаў жалобны настрой тэатральнай залы пасля паведамлення аб зладзейскім забойстве Кірава.

Альманах падабраны да некаторай ступені выпадкова, уключана ўсяго 6 аўтараў; між іх ёсць і такія, якія ўжо даўно не працуюць на Беларусі, і не ўключаны аўтары, якія часта друкуюцца ў нашым перыядычным друку на рускай мове. Альманах сваёй творчай работай павінен аб'яднаць вакол сябе ўсю здольную пішучую моладзь. Гэтае добрае пачынанне трэба прадоўжваць выданнем наступных альманахаў.

Андрэй УШАКОЎ.



ПАРАД ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ У МЕНСКУ

На здымку: студэнты менскага ордэнаноснага інстытута фізкультуры на парадзе 30 жніўня.

РАБОТА НАД СПЕКТАКЛЕМ „ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ“

Работа над п'есай Нік. Пагодзіна «Чалавек з ружжом» у Віцебскім Белдзярждрамтэатры ў поўным разгары.

Рэжысёры Віньяр і Тамарын ужо заканчваюць прапрацоўку другога акта. Гэты акт самы складаны. Тут адбываюцца сустрэчы Шадрына з Леніным — кульмінацыйны момант п'есы. Калектыў тэатра працуе над п'есай з вялікім захапленнем і сур'ёзнасцю. Гэта відаць па ўсім—і па дысцыпліне на рэпетыцыях, і па прапрацоўцы роляў акторамі, і па соцыялістычнаму спаборніцтву, якое разгортваецца паміж асобнымі ўдзельнікамі спектакля, акторамі і цэхамі.

Аднaчасова з рэпетыцыямі ідзе работа па афармленню паказу—шыццё касцюмаў, пошукі грымаў і т. д. Тэатр імкнецца да таго, каб спектакль, у якім будуць паказаны вобразы вялікіх правадыроў працоўных усяго свету Леніна і Сталіна, быў хвалюючым і глыбокім, як хвалюючы і глыбокі з'явы і вобразы, якія ён раскрывае.

Д.

ГАСТРОЛІ ХОРА ФІЛАРМОНІІ

10 верасня хор Дзяржаўнай філармоніі БССР выязджае на гастролі, прысвечаныя 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола. Маршрут хора: Смалявічы—Барысаў—Крупкі — Халопенічы — Талачын—Круглае—Орша—Друць — Рагачоў. У кожным горадзе і мястэчку хор дасць па два-тры канцэрты. Апрача 30 старых песень, хор вязе з сабой новы рэпертуар: «Песню аб Будзённым», рускія народныя песні ў апрацоўцы прафесара Гедыке, украінскую песню «Ой наступіла чорная хмара» ў апрацоўцы кампазітара Шчэглова і інш. З класікаў хор уключыў у свой рэпертуар «Элегію» Калінікава.

У часе гастроляў, якія прадоўжацца каля месяца, хор падрыхтуе новыя песні, у тым ліку рад маладзёжных. Хор узяў на сябе абавязацельства дапамагчы самадзейным харавым гурткам гарадоў і мястэчак, дзе ён будзе выступаць, лепш падрыхтавацца да дваццацігоддзя комсамола.

У канцэртах хора прымуць удзел баяніст Растоўскай філармоніі С. С. Дэмент і чпец М. З. Леанідава.

***

Пасля звароту хора, на гастролі па раёнах БССР выедзе аркестр народных інструментаў філармоніі БССР. Аркестр наведае Пухавічы, Асіпавічы, Бабруйск, Жлобін, Гомель, Добруш, Нова-Беліцу і Рэчыцу.

НОВЫЯ РАБОТЫ КАМПАЗІТАРА ЧУРКІНА

Старэйшы кампазітар БССР Н. Н. Чуркін плённа працуе над новымі музычнымі творамі. Гэтымі днямі ён закончыў сюіту на беларускія тэмы для сімфанічнага аркестра.

Ім-жа зроблена аркестроўка оперы Буглая «Радзіма кліча» для аркестра мастацкай самадзейнасці. Гэтая-ж опера часткова была развучана Чуркіным з оперным калектывам Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. Неабходна, каб Саюз кампазітараў давёў справу да канца і разам з рэжысёрам паставіў бы гэтую оперу ў Горках. Трэба часцей практыкаваць такія выезды кампазітараў у калектывы мастацкай самадзейнасці, гэта з'яўляецца каштоўным мерапрыемствам і канкрэтнай дапамогай беларускай самадзейнасці.

Зараз Н. Чуркін працуе над операй самадзейнасці «Кок-сагыз» паводле лібрэта маладых паэтаў Жаўрука і Ушакова.

У Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР

Зараз у тэатры ідзе работа над першай совецкай беларускай операй «Міхась Падгорны» кампазітара Е. Цікоцкага паводле лібрэта П. Броўкі.

Гэтымі днямі ў прысутнасці мастацкай грамадскасці Менска былі зданы хоры оперы, пастаўленыя мастацкім кіраўніком харавога цэха хормейстэрам Сцяпанавым. Прысутныя гэтую работу сустрэлі цёпла.

Таксама быў абмяркован макет і эскізы касцюмаў, прадстаўленыя мастаком Матруніным. У спрэчках выступілі беларускія мастакі, работнікі тэатра і іншыя і зрабілі рад істотных заўваг. Афармленне оперы «Міхась Падгорны» будзе яшчэ дапрацавана.

Зараз заканчваецца развучванне оперных партый «Міхася Падгорнага» салістамі і аркестрам тэатра.

***

30 жніўня ў Тэатры оперы і балета адбылася праглядавая рэпетыцыя балета «Лебядзінае возера» Чайкоўскага. На праглядзе прысутнічалі прадстаўнікі тэатра і некаторыя работнікі беларускага мастацтва. Балет пастаўлены балетмейстэрам Мулерам.

***

Тэатрам оперы і балета ў хуткім часе будуць праведзены лекцыі, канцэрты на прадпрыемствах Менска, якія пазнаёмяць рабочых з рэпертуарам, тэатра, што будзе паказан у гэтым годзе.

***

У тэатр запрошаны на пасаду намесніка дырэктара па мастацкай частцы і галоўнага рэжысёра тав. Рапапорт, галоўным дырыжорам — ордэнаносец тав. Грубін, салістам (драматычны тэнар)—артыст Вялікага тэатра тав. Лапін і хормейстэрам—тав. Кананенка.

***

Дзяржаўны тэатр оперы і балета прыкладна з 15 кастрычніка пачынае працаваць у памяшканні Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра. Асенні сезон тэатр адкрые двума новымі пастаноўкамі: «Царская нявеста» ў пастаноўцы В. Р. Рапапорта (дырыжор Н. Б. Грубін, мастак—заслужаны дзеяч мастацтваў ордэнаносец Ф. Ф. Федароўскі) і «Лебядзінае возера» ў пастаноўцы К. А. Мулера (дырыжор Ратнер, мастак Матрунін).

Апрача таго будуць выпушчаны «Русалка» ў пастаноўцы Рапапорта (дырыжор Грубін, мастак Панадзіадзі) і «Чыо-Чыо Сан».

З старога рэпертуара ў памяшканні Яўрэйскага тэатра будуць паказаны «Ціхі Дон», «Тоска», «Рыгалето» і «Марная перасцярога». Спектаклі ў памяшканні Яўрэйскага тэатра прадоўжацца да 1 студзеня 1939 года.

***

25 кастрычніка Тэатр оперы і балета пачне рэпетыцыі ў новым Вялікім тэатры. Зімовы сезон свой у Вялікім тэатры, Тэатр оперы і балета пачне ў студзені операй «Міхась Падгорны». Пасля гэтага будзе выпушчан балет «Салавей» і опера «Дрыгва». Апошняй пастаноўкай зімовага сезона будзе балет.

З старых пастановак на сцэну Вялікага тэатра будуць перанесены «Ціхі Дон», «Лебядзінае возера» і «Царская нявеста».

***

Загадам Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР дырэктар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Ярыкаў вызвален ад работы і замест яго прызначан О. А. Гантман.



Група ўдзельнікаў ад БССР на першай Усесаюзнай спартакіядзе работнікаў мастацтва ў Кіеве.



ВЫХОДНЫ ДЗЕНЬ У ПІОНЕР ЛАГЕРАХ НКВД

На здымку: педагог Дзяржаўнай беларускай кансерваторыі т. Савіцкі ў гасцях у піонераў.

Фото Невядомскага.

ПАЛЕСКІ ДРАМТЭАТР ЧАКАЕ ДАПАМОГІ

Палескі абласны драмтэатр, рэарганізаваны з Мазырскага калгасна-соўгаснага тэатра, узмоцнена рыхтуецца да адкрыцця асенне-зімовага сезона. Тэатр працуе зараз над п'есай «Чужы» Салаўёва; да канца года пакажа новую пастаноўку «Любоў Яравая». Такім чынам, у рэпертуары тэатра будуць «Партызаны» К. Крапівы, «Чужы» Салаўёва, «Любоў Яравая» Трэнева, «Простая дзяўчына» Шкваркіна, «Агні маяка» Карасёва і «Мая маці» Наўрозава.

У 1939 годзе тэатр мяркуе выпусціць наступныя спектаклі: «Не было ні граша, а раптам алтын» А. Астроўскага, «Народжаныя бурай» паводле рамана Н. Астроўскага, «Зямля» Вірта, «Расплата за маладосць» К. Чорнага, «У пушчах Палесся» Я. Коласа і інш.

Для таго, каб з поспехам справіцца з гэтай праграмай, тэатру патрэбны кадры. Зараз замест 25 актораў тэатр налічвае ўсяго толькі васемнаццаць чалавек. І паколькі ўсе васемнаццаць чалавек працуюць з поўнай нагрузкай, а вядучыя акторы заняты ў кожным спектаклі, то кожны непрадбачаны выпадак (хвароба ці іншая прычына нявыхаду актора на работу) ставіць рад пастановак пад пагрозу зрыву.

Умовы работы тэатра маюць рад недахопаў. Будынку тэатра патрэбен рамонт. Многія акторы без кватэр. Частка будынка тэатра занята іншымі арганізацыямі (Чырвоны крыж, дзіцячая бібліятэка). Няма рэпетыцыйнай залы (занята Асоавіяхімам). Няма дзе арганізаваць буфет. І гэта не гледзячы на пастанову Соўнаркома БССР, якая абавязвае мясцовыя арганізацыі вызваліць памяшканне тэатра ад пабочных устаноў.

Усе гэтыя недахопы трэба тэрмінова ліквідаваць. У прыватнасці, дапамогу Палескаму тэатру акторамі павінны аказаць вядучыя тэатры БССР. Трэба ўмацаваць Палескі абласны тэатр здольнымі кадрамі і даць яму магчымасць паспяхова справіцца з адказнымі задачамі.

П.

Старонкі з гісторыі тэатра

Праф. А. ДЖЫВЕЛЕГАЎ

Англійскія тэатры пры Шэкспіры

Сцэнічнае мастацтва ў Англіі развівалася задоўга да Елізавецінскай эпохі сваімі шляхамі, іншымі, чым кантынентальны тэатр. Англійскі народ стварыў сваё публічнае відовішча, якое адпавядала яго тэмпераменту і яго эстэтычным густам. Асновы старога англійскага сцэнічнага мастацтва і ўвайшлі адным з найбольш істотных элементаў у стварэнне сцэны і ў акторскае майстэрства шэкспіраўскіх часоў. Ад старажытнасці засталася і аснова сцэны, яе пляцформа.

Англійская драматургія, у цэнтры якой стаіць Шэкспір, стваралася са зліцця двух патокаў, якія вызначалі рост тэатральнай культуры пры першых двух Тюдорах: драматургіі народнай, містэрыйна-маралітэтнай і драматургіі гуманістычнай, рэцыпіраваўшай класічныя традыцыі. А глебаю, на якой хутка ўзышлі пры Елізавеце парасткі новай драматургіі, быў незвычайны ўздым, у якім удзельнічалі ўсе кіруючыя грамадскія групы, і які прывёў да сапраўднага выбуху драматургічнай творчасці пасля перамогі над «Непераможнай Армадай», якая была паслана для заваёвы Англіі Філіпам II Іспанскім. Англія адным ударам забяспечыла сабе свабоду ў разгортванні сваёй эканамічнай магутнасці, якая пайшла на карысць абодвум кіруючым класам грамадства: новаму дваранству і новай буржуазіі Адчуванне радасці жыцця, упэўненасць у заўтрашнім дні, матэрыяльная забяспечанасць і багацце, — усё гэта падказвала новыя словы, усё гэта патрабавала новай мовы, і тэатр станавіўся рупарам новаскладўшагася ўспрынятага жыцця. З'явіліся людзі, якія ўмелі звяртацца да гэтага новага грамадства.

«З казачнай хуткасцю, — расказвае адзін пісьменнік, якому можна дараваць крыху апакаліптычны тон за ярвія фарбы, — нараджаюцца новыя людзі, якія валодаюць гэтай мовай, паэты — поўсотні, сотня на працягу аднаго тысячагоддзя — буяныя неўгамаваныя гулякі. Гэтыя не абрабляюць садоў Аркадзіі, падобна прыдворным паэцікам папярэдняй эпохі, не пераказваюць у вершах прылізаную міфалогію. Яны атакуюць тэатр, заваёўваюць арэну, якія да таго часу служылі толькі для траўлі звяроў і крывавых гульняў. Гарачы пар крыві яшчэ дыміцца ў іх творах: іх трагедыі — пакуль яшчэ такі-ж рымскі цырк, у якім ненасытныя пачуцці атручваюцца, як дзікія звяры. Нястрымна бушуюць іх львіныя страсці. Яны імкнуцца перавысіць адзін другога ў жорсткасці і пачварнасці. Усё дазволена пяру: і кровазмяшанне, забойствы, усякія злачынкі і ўсякія злачынствы; нечуванае бязладнае сплячэнне ўсяго чалавечага спраўляе бурную оргію; падобна галодным звярам, якія выпушчаны з клеткі, выкідваюцца на абгароджаную драўляным бар'ерам арэну грозныя, ап'яняючыя страсці... Ледзь чутны асобныя галасы, ледзь пазнаваемы асобныя постаці ў гэтай эргіі магутнасці. Адна страсць узбуджае другую. Кожны дае, кожны крадзе, кожны спаборнічае з другімі, каб перавысіць іх, быць першым...».

Тэатры большай часткай будуюцца на паўднёвым беразе Тэмзы, там, дзе раней змяшчаліся балаганы для паказу мядзвежай траўлі, воўчых і зайчых садкоў, петушыных баёў. Уласнікі тэатраў — ранейшыя ўласнікі гэтых балаганаў, накшталт Хэнсло, які трымаў і пазней, адначасова з тэатрам, публічныя дамы. У першы час самымі старраннымі наведвальнікамі тэатраў былі людзі, якіх карміла Тэмза: матросы, лодачнікі, партовыя рабочыя, рыбакі, альбо людзі, якія па Тэмзе падтрымлівалі зносіны з Лонданам: гандляры, рамеснікі, прышэльцы з правінцый простага звання, салдаты. Але мала-памалу да новых драўляных будынкаў тэатраў, якія павялічваліся амаль з кожным годам, стала цягнуцца публіка з арыстакратычных і буржуазных частак Лондана. Прыдворныя, тытулаваныя асобы, свецкія франты і дамы, якія не забывалі захапіць з сабою маску, каб не паказваць твару плебейскаму партэру; чванлівыя джэнтэльмены з Сіці ў чорным, у круглых высокіх капелюшах, якія перамагалі пурытанскае папярэджанне супроць відовішча «нячысціка». Усе яны за гадзіну ці паўтары да пачатку спектакля, — ён пачынаўся ў 3 гадзіны дня,—пад'язджалі верхамі і ў экіпажах у суправаджэнні лакеяў і слуг да прыступак лонданскай прыстані паўночнага берага і цясніліся да лодак, якія тоўпіліся ля прычалаў. Зачынаўся крык, завязваўся гандаль, грымелі аглушальныя заклікі лодачнікаў. Лодкі адыходзілі цяжка нагружаныя і высаджвалі ля паўднёвага берага багатую «чыстую» публіку. Пры высадцы крыкі станавіліся яшчэ гучней, таму што важныя кавалеры і скнарыстыя купцы імкнуліся заплаціць лодачнікам па таксе, якая была ўстаноўлена яшчэ пры Марыі Крывавай і даўным даўно яе ніхто не прытрымліваўся. Тэатры хутка запаўняліся.

Усе ведаюць, што будынак англійскага тэатра Елізавецінскай эпохі — спачатку — ні што іншае, як гасцінічны двор. Дзверы звонку, ля якіх віселі шырокавяшчальныя афішы і змяшчаўся вартаўнік, які адбіраў уваходныя грошы, вялі ў «глядзельную залу». Яна дзялілася на дзве паловы, амаль роўныя. Меншую займала сцэна, большую — партэр. Над сцэнай быў дах, які трымаўся на слупах, над партэрам—хмурае лонданскае неба. З трох бакоў — выключаўся, вядома, бок, да якога далучалася сцэна — ішла галерэя ў тры ярусы. Бліжэйшая да сцэны частка была падзелена на ложы. Іх займалі пажылыя прадстаўнікі і дамы арыстакратыі. Для буржуазіі заставаліся баковыя галерэі. Маладыя франты з арыстакратыі завяявалі сабе прывілей сядзець на сцэне, на абодвух яе краях, на складаных крэслах і лаўках, якія неслі за імі іх лакеі. І ў іх лічылася яшчэ за вышэйшы шык увайсці на сцэну, пасля таго, як пачалося прадстаўленне. Людзі з ракі, ранейшыя непадзельныя гаспадары тэатра стаялі ў партэры ў перамежку з прыслугай багатай часткі публікі. Гэта была самая жывая і самая неспакойная частка глядзельнай залы, яе сталыя наведвальнікі.

Яны набіваліся ў тэатр задоўга да пачатку спектакля. Многія прыносілі з сабою харчы і выпіўку. Да паслуг тых, хто не здагадаўся гэтага зрабіць, былі шматлікія гандляры ўсякімі стравамі, півам і элем, якія шнэндаліся паміж імі. Вялікае спажыванне напіткаў зрабіла неабходным абсталяванне тут-жа патрэбных прыстасаванняў, змяшчаемае якіх вылівалася ў абкружаўшы будынак тэатра роў. Прыбраныя дамы, якія перахадзілі праз гэты роў па мосціках, агідліва закрывалі насы хустачкамі, на якіх, як у Дэздэмоны, былі вышыты, напэўна, ягады суніцы. А ў самым тэатры, каб хоць крыху паменшыць смурод, час-ад-часу палілі вецце ядлоўца. Па меры набліжэння вызначанага часу ўзбуджэнне партэра расло. Галовы, разгарачаныя выпітым, рабіліся больш адчувальнымі да крыўд, сапраўдных і ўяўляемых. Гутаркі і спрэчкі рабіліся больш шумнымі і часта пераходзілі ў драку, якая амаль ніколі не абмяжоўвалася першымі яе зачыншчыкамі. Зладзеі і кішэннікі лоўка карысталіся сумятнёй, каб забрацца ў чужыя кішэні, але бяда, калі іх лавілі. Білі не спяшаючыся, доўга, няшчадна. Пры такім узбуджэнні і звычайныя сваркі паміж публікай партэра і прадстаўнікамі знаці, што сядзела ў ложах і на сцэне, часта прымалі характар міжусобнай вайны, якая ўзнаўляла добра вядомыя абодвум варожым бакам па гістарычных п'есах сцэны міжусобіцы Чырвонай і Белай Ружы. Са сцэны на партэр і назад ляцелі ўсякія аб'едкі: косці, тухлыя яйкі, гнілыя яблыкі і іншыя лёгка здабываемыя кідальныя снарады. Калі ўзбуджэнне прымала характар небяспечны для захавання сцэнічных пабудоў, на авансцэне паяўляўся хто-небудзь з любімых актораў: у Глобусе — Рычард Бербэдж, у тэатрах Хэнсло — Эдуард Алэйн. Ім, хоць і з цяжкасцямі, удавалася дамагчыся калі не міру, дык перамір'я, якое дазваляла пачынаць ці прадаўжаць прадстаўленне.

Арэнаю яго была славутая елізавецінская сцэна, адна з самых выдатных тэатральных пабудоў па прастаце і незацейлівасці. Нічога падобнага на складанае сцэнічнае афармленне сучасных тэатраў англійскія тэатры XVI—XVII стагоддзяў не ведалі. Сцэна была не больш як простым драўляным памостам, які быў умацаван на невысокіх, вельмі моцных слупах і абіты дошкамі. Пярэдняя яго частка не злучалася з баковымі галерэямі. Вакол яе можна было стаяць з трох бакоў. Магчыма, што яна некалькі звужвалася спераду, па крайняй меры, у некаторых тэатрах. Гэта стварала вялікую свабоду ігры на прасцэніуме. Задні бок сцэны далучаўся да галерэі, убіраючы яе такім чынам у сістэму сцэнічнай канструкцыі. Верхні ярус галерэі быў ператваран у верхнюю сцэнічную пляцоўку. Ніжні яе ярус, часам снабжоны асобай заслонай, станавіўся такім чынам глыбіннай часткай сцэны. Прасцэніум у некаторых тэатрах выступаў з-пад даху. Часам паміж прасцэніумам і пакрытай часткай сцэны была працягнута паміж слупамі, якія падтрымлівалі дах, яшчэ адна заслона. Пярэдняй заслоны, вядома, не было.

Дзея на гэтых чатырох частках сцэны размяркоўвалася такім чынам. На прасцэніуме большай часткай разыгрываліся сцэны на адкрытым паветры, у задняй палове — сцэны ў залах, палацах, унутры дамоў і г. д. На гэты выпадак у кутку задняй паловы сцэны стаяў бутафорскі трон, які высоўваўся пры неабходнасці на сярэдзіну; тут ужо ўсе разумелі, што дзея адбываецца ў палацы. Каб канчаткова не было сумнення ў тым, што яна ідзе ўнутры дома, на адну са сцэн часам вешалі невялікую чатырохкутную раму з двума скрыжаванымі чорнымі лініямі: вакно. На глыбіннай сцэне іграліся моманты, якія патрабуюць запемненага святла, больш інтымна паказваемых перажыванняў, а верхняя адводзілася для паказу момантаў, якія адбываюцца ў спальнях, — спальня ў Англіі заўсёды знаходзілася на верхнім паверсе дома, — на балконах, на гарадскіх сценах і г. д. Акрамя гэтых звычайных чатырох сцэн, былі яшчэ дзве: вежа, якая ўзвышалася над верхняй сцэнай, — там паяўляліся персанажы, якія дзейнічалі з вежаў гарадскіх умацаванняў і інш., і люк, адкуль выходзілі і куды правальваліся дзейнічаючыя асобы, калі згодна сюжэту ў гэтым паяўлялася неабходнасць.

Так як прадстаўленні даваліся выключна ўдзень, дык натуральна ніякія светлавыя эфекты не былі магчымы. Адзіным асвятляльнікам і рэфлектарам было капрызнае лонданскае сонца, якое часам любіла сыграць над акторамі і над публікай вельмі нядобрыя жарты. Але так як часам паяўлялася неабходнасць даць зразумець глядачу, што дзея адбываецца ўначы, дык заднік сцэны зацягвалі чорнай матэрыяй: глядач зараз-жа разумеў, у чым справа. Дэкарацыі былі надзвычай бедныя. Мізэрнае маленькае дрэўца азначала дрымотны лес, кавалак дзёрну—поле і г. д. Больш дэтальныя дэкарацыі глядач прыносіў у тэатр з сабою: у сваім уяўленні. Затое касцюмы былі незвычайна багатыя. Тэатр не шкадаваў на іх грошай, і акторы, асабліва буйныя, часта прыплачвалі з сваёй кішэні вялікія грошы, каб бліснуць перад публікаю раскошнай вопраткай. Жаночыя касцюмы рабіліся, вядома, выключна за кошт антрэпрызы, таму што актрыс у трупах не існавала і ўсе жаночыя ролі выконваліся юнакамі далікатнага стану, якія мелі мілавідныя твары. Іх імкнуліся, калі яны валодалі талентам, утрымаць на гэтых ролях як можна больш, хоць ад гэтага нярэдка адбываліся няёмкасці: у іх вельмі хутка пачынала прабівацца расліннасць на твары. І калі публіка асабліва шумела, каб пачыналі спектакль, выходзіў з пакорлівым выглядам хто-небудзь з актораў і прасіў спагады, спасылаючыся на тое, што Дэздэмона ці Кордэлія яшчэ не пабрыліся. Убогія ўмоўнасці сцэнічнага абсталявання ўжо ў сучаснікаў выклікалі едкія кпіны. Алукаванейшы гуманіст, прыхільнік класічнай драматургіі, сэр Філіп Сідней, гаварыў з прычыны гэтых умоўнасцей: «Глядзіце, вось тры дамы пайшлі прагуляцца і нарваць кветак; вы, вядома, уяўляеце сабе на сцэне сад. Але праз некаторы час вы пачуеце тут-жа гутарку пра караблекрушэнне і вас пакрыюць ганьбаю, калі вы не ўявіце сабе скалы і мора. Вось дзве арміі з чатырма мечамі і адным шчытам, і чыё чорствае сэрца не адчуе пры гэтым усіх трывог генеральных боек?»

Але ўбогасць сцэнічнай абстаноўкі не перашкаджала публіцы атрымоўваць на тэатры такое надзвычайнае задаволенне. Усё выкуплялася высокімі якасцямі драматургічнага матэрыялу і выдатнай акторскай ігрой. Акторы, як на трагічныя і гераічныя ролі,—напрыклад, памянёныя вышэй Бербэдж і Алэйн, — так і комікі — Тарльтон ці Кэмп — былі майстрамі амаль што геніяльнымі. А колькі геніяльных драматургаў паявілася ў Англіі паміж 1580 і 1625 гадамі!

Акрамя публічных тэатраў, тут апісаных, у Лондане былі яшчэ і прыватныя тэатры ў зачыненым памяшканні, ужо з сапраўднай сцэнічнай каробкаю, з сядзячым партэрам, з больш складанымі дэкарацыямі, з больш шырокімі магчымасцямі сцэнічных эфектаў. Але сапраўднае тэатральнае жыццё і сапраўдныя падзеі на тэатральным фронце ішлі міма гэтых прыватных тэатраў, яны адбываліся выключна ў тэатрах публічных, тэатрах, даступных не толькі для багатай і заможнай часткі англійскага грамадства, але і для народа, тэатрах, якія былі патрэбны народу, якія неслі ў яго і культуру, і палітычную прапаганду, і якія ад народа атрымоўвалі сваю сапраўдную ідэйную і творчую зарадку.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрэс рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № К—5607.

Рыгора Нехая

Малады паэт Рыгор Нехай нарадзіўся ў 1915 годзе ў вёсцы Сяліба, Бярэзінскага раёна ў сям'і незаможнага селяніна. Дзіцячыя гады яго прайшлі тут, у вёсцы, дзе ён скончыў пачатковую школу. Паступіўшы ў сямігодку, там Нехай бліжэй знаёміцца з беларускай літаратурай. Сам спрабуе пісаць вершы.

1935 год у жыцці Рыгора Нехая адзначаецца як пачатак самастойнай жыццёвай дзейнасці і пачатак свядомай творчай працы: ён закончыў Беларускі педагагічны тэхнікум і надрукаваў свае першыя вершы. Пазней друкаваўся ў альманаху «Аднагодкі», у журнале «Полымя Рэволюцыі», у газеце «Літаратура і Мастацтва».

Тэматыка творчасці Нехая ў пераважнай большасці калгасная. Яго хвалюе калгасная праца, заможнае жыццё калгаснікаў, адпачынак моладзі, весялосць, радасць.

Яго вершы дыхаюць свежасцю, жыццёвай радасцю, сонечным аптымізмам. Малады паэт імкнецца глыбей вывучыць нашу багатую рэчаіснасць, знаходзячы ў ёй канкрэтнае, характэрнае, каб паказаць праз іх велічнасць жыцця.

Не дрэнна валодае Рыгор Нехай пейзажам. Праўда, тут яму трэба ўнікаць перайманняў, якія ідуць ад Блока, Фета. Трэба шукаць свой паэтычны манер, свой голас. Таварышу Нехаю трэба вельмі сур'ёзна працаваць над сабой, над мовай, каб пазбыцца тых прымітываў, якія даволі часта сустракаюцца ў яго творчасці.

Сёння мы знаёмім чытачоў з новымі вершамі паэта Рыгора Нехая.

Паходная

Песні ходзяць ад мора да мора.
Пра маршалаў спявае народ,
Як вялі праз гушчы і горы
Нашу армію ў час непагод.

Па лугах, па шырокіх далінах
Вераснёвыя ночы цвілі,
Пра герояў складаюць быліны
Ураджайныя нашы палі.

Мы і сёння к паходу гатовы,
Змесці ворага з твару зямлі,
Каб пад сонцам шчаслівай парою
Праца, моладасць вечна жылі.

Песні ходзяць ад мора да мора,
Пра маршалаў спявае народ,
Павядуць нас Крэмлёўскія зоры,
Павядуць за радзіму ў паход.

Каб сады зацвілі

Па іспанскаму мірнаму краю
Рэкі братняй крыві пацяклі.
Наляцелі бандыцкія зграі,
Самалёты з-пад хмар загулі.

Клічуць шумам трывожным дубравы,
Неспакойныя нівы, палі.
Бараніць чалавечае права —
Мірна жыць на радзімай зямлі.

Хутка прыдзе абмыты крывёю
Перамогі квітнеючы дзень.
Гераічны народ! Мы з табою.
Правадыр нас вялікі вядзе.

Уздымайце ўвесь гнеў чалавека
Супроць дзікай фашысцкай арды,
На зямлі зацвілі каб навекі
Чалавечага шчасця сады.

Сыну

Маці ў вёсцы шчаслівай часінай
Гадавала харошага сына,
У руках сваіх белых трымала,
Сыну гэткую песню спявала:

Угадаць не магу тваё долі
Толькі знаю: ніколі, ніколі
Ты не будзеш, мой сын, у няволі,
Угадаць не магу тваё долі.

За вакном дзве рабіны шумелі...
Вочкі сына, як зоркі, гарэлі.

Можа будзеш ты плаваць на моры,
Дзе так ззяюць паўночныя зоры;
Можа будзеш ты смелым героем,—
Пойдзе слава твая над зямлёю.

Будзе горда табою краіна,
Узгадаваўшая гэткага сына.
Будзе рада калгасніца-маці
Дарагому гасцю ў сваёй хаце.

Маці ў вёсцы шчаслівай часінай
Нарадзіла харошага сына.

На палянку лажыцца змрок

На палянку лажыцца змрок.
На палянцы аўсы зажаты.
Падымаецца к небу дымок
Над калгаснаю новай хатай.

Закіпае густая ноч
Неяк ціха, як бляск зарніцы.
Прагным позіркам цьмяных воч
Паглядаюць з травы крыніцы.

Залатыя цвітуць верасы.
Вось пара тапалінай песні!
Добра мне ад такой красы.
Родным песням у сэрцы цесна.

Запылала раса агнём.
Барвянеюць кляны ў полі
І красы той ні ноччу, ні днём
Не запляміць ніхто, ніколі!

***

Чырвоны мак і сонечная лета
У памяці вязу з калгасных вёсак.
Да краю повен я ружовым цветам
Даспеўшых вішань і ліствой бярозак.

Яны растуць, як людзі, маладыя
Па курганах, ля сініх ручаёў.
Іх песціць добраю рукой стыхія:
Дажджамі, сонцам, песняй салаўёў.

Як добра тут, дзе воля і прасторы,
Дзе людзі рады працаю сваёй.

Тут па начах цвітуць на небе зоры,
І месяц ветразем плыве над галавой.

Я ўсхваляваны. Радасць не схаваю,
Што ў душу навекі ўвайшла.
Перада мной шумяць сады без краю,
Ды нівы жоўтыя вакол сяла.

Чырвоны мак і сонечнае лета
У памяці вязу з калгасных вёсак.
Вітанне шлю ўсёй душой паэта
Лістве і росам маладых бярозак.

Падарожжа на Малой Беларускай чыгунцы

-о-

ЯНКА МАЎР

-о-

На карце вы яе не знойдзеце. Можа таму, што пабудавана яна ўсяго толькі два гады назад і яшчэ не ўключана ў агульную сетку чыгунак СССР; а можа таму, што яна ўсё-ж такі завецца Малой чыгункай.

Ва ўсякім разе на пасажырскім руху гэта не адбіваецца, і кожны грамадзянін можа без перашкоды зрабіць па ёй падарожжа ад ст. Раласнай да ст. Шчаслівай, ці наадварот. Білет трэба браць да ст. Гомель, а там ужо будзе перасадка на ст. Радасную М. Бел. чыг. У 1938 годзе па ёй перавезена пяцьдзесят тысяч пасажыраў, і праехалі ўсе яны разам — дваццаць тысяч кілометраў. Вылічвайце самі, якую даўжыню мае магістраль.

Перад вакзалам — ганаровая дошка у адзнаку дваццацігоддзя Ленінскага комсамола. Стрэлачнік Долін Р. А., намеснік начальніка дарогі Фінкельштэйн І. Г., машыніст П. Ульяніцкі, дзяжурная па станцыі Л. Лазоўская ды яшчэ дзесятак імён складаюць авангард слаўнай чвэрцьтысячнай арміі чыгуначнікаў Малой Беларускай. Многія з іх атрымалі каштоўныя падарункі — гадзіннік, фотаапарат, веласіпед. Усе спецыяльнасці прадстаўлены на ганаровай дошцы. Усім аднолькавая пашана, абы толькі быў добры работнік.

Але сярод чыгуначнікаў Малой Беларускай у гэтым сэнсе наглядаецца адна нездаровая рыса: усе хочуць быць або машыністамі, або дзяжурнымі па станцыі.

Адзін стрэлачнік, паважаны такі чалавек, у форме, з флажкамі і дудкай, нават расплакаўся, нібы дзіця якое:

— Не хачу быць стрэлачнікам! Хачу быць дзяжурным па станцыі! Я ўжо цэлы месяц прабыў стрэлачнікам.

Усёй адміністрацыі, на чале з начальнікам дарогі, давялося ўгаварваць яго:

— Які ты будзеш дзяжурны па станцыі, калі не будзеш ведаць як стрэлку перавесці? Трэба спачатку азнаёміцца з працай стрэлачніка, кандуктара, кантралёра, а потым ужо быць дзяжурным.

— А чаму Лізу адразу назначылі дзяжурнай па станцыі? — хмура адказаў стрэлачнік.

Начальства зачмыхала носам.

— Мгм... Э-э... Бачыш, гэта было зроблена раней. А цяпер ужо кожны павінен пачынаць службу з працейшых пасад. Пачакай трошкі, перавядзем і цябе.

Хоць паравоз яшчэ больш прывабны, як чырвоная шапка дзяжурнага, але адразу прэтэндаваць на машыніста ніхто не адважваецца. Гэтай кваліфікацыі дабіваюцца паступова, і маладзей за васьмікласніка машыністы звычайна не бываюць. Двое з іх сёлета нават ездзяць практыкантамі па вялікай чыгунцы.

Мне пашанцавала: чарга ля касы невялікая — дзве дзяўчынкі па семвосем гадоў, ды прыезджы «турыст». Гэты хлапчук за сёнешні дзень ужо восьмы раз купляе білет (які каштуе дзесяць капеек, а для дарослага — дваццаць).

У білетнай касе—сталая касірша гадоў трынаццаці ды маленечкая палахлівая «практыкантка». Перад кожным рухам, азіраючыся на старэйшую, практыкантка закампасіравала і выдала мне білет. Я з ім адразу-ж падаўся на перон. Але дванаццацігадовы кантралёр сурова спыніў мяне:

— Нельга. Поезд яшчэ не прышоў.

Я паспрабаваў быў спрачацца, а потым, каб улагодзіць яго, пачаў жартаваць, але кантралёр сур'ёзна зірнуў на мяне, як на малога недысцыплінаванага хлапчука, паўтарыў «нельга» і адвярнуўся. У гэты момант я сапраўды адчуў сябе хлапчуком перад ім.

Пачуўся далёкі грукат поезда, гудок паравоза, адказ стрэлачніка. Зазвінеў службовы тэлефон. На перон выбег дзяжурны па станцыі — дзяўчынка гадоў пятнаццаці, у форме, у чырвонай шапцы. Паравоз і два вагоны спыніліся каля платформы. З паравознай будкі выглянула замурзаная фізіяномія шаснаццацігадовага машыніста. (Тут недзе ёсць і дарослы машыніст — інструктар, які кіруе ўсёй справай, ды публіка яго не заўважае).

Я зноў сунуўся на перон і зноў мяне не пусціў непахісны перонны кантралёр:

— Пачакайце, дзядзя. Пасадкі яшчэ няма.

Ах, каб табе вырасці здаровым! Вось дык бюракрат!

Прайшло яшчэ некалькі мінут, пакуль паравоз перагналі на другі канец поезда, перанеслі ліхтары, афарміліся ў дзяжурнага па станцыі — і тады толькі пусцілі нас у вагон.

Вагоны мне не спадабаліся: яны маглі-б быць крыху большымі, ды і па выгляду яны не падобныя на сапраўдныя пасажырскія вагоны. Але пасажыры адчувалі сябе лепей, як ва ўсіх найсапраўднейшых вагонах. І шчаслівей за ўсіх быў «турыст». Хто ведае, — можа гэта будучы Крыванос, ці нарком шляхоў зносін СССР?..

Поезд крануўся. З кабінета начальніка станцыі выразна чуецца голас:

— Выклікаю станцыю Шчаслівую. Адпраўляю поезд № 12 14 гадзін 17 мінут...

Палатно чыгункі ва ўзорным парадку. Па баках — нітачкі з белых каменьчыкаў. Гэта заслуга брыгадзіра Балэкі і яго таварышоў. Ён самы малы па росту і самы вялікі энтузіяст сваёй справы. Аднаго разу ён са сваёй брыгадай прабіўся да начальніка вялікай Беларускай чыгункі і прывёз цэлы грузавік карысных для сваёй гаспадаркі рэчаў.

Пасля таго начальнік папракнуў кіраўніка Малой чыгункі:

— Нашто вы пасылаеце ка мне рабят па такіх справах, якія можна зрабіць без мяне?

Начальнік Малой дарогі здзівіўся: ён зусім і не ведаў аб гэтым паходзе бравага брыгадзіра. Прышлося зрабіць яму афіцыяльны выгавар за анархічны ўчынак. Ну, а неафіцыяльна можа было і інакш...

Чыгуначная паласа цяпер не толькі адгароджана, але і заслонена густымі дрэвамі і хмызняком. А раней не было рады ад парушальнікаў чыгуначнай тэрыторыі. Ахова часта лавіла іх, складала пратаколы і штрафавала парушальнікаў па 5 капеек.

Вось круты паварот. Раней тут паравоз сходзіў з рэек, пакуль не перамянілі іх на больш цяжкія. Далей — віядук праз дарогу, які замяніў ранейшы пераезд; тут стаіць будка, і застаўся яшчэ замацаваны шлагбаум. Паказалася станцыя Шчаслівая. Падняўся семафор.

Да нас падышлі праваднік і кантралёр. У кантралёра ў руках бліскучая машынка для прабівання білетаў, «сапраўдная», якая ўжываецца і на вялікіх чыгунках.

У гэты момант у мяне неяк вылецеў з рук білет.

— Што рабіць? — кажу кантралёру. —Білет вываліўся праз акно.

Кантралёр і праваднік былі збянтэжаны больш за мяне. Пазіралі адзін на аднаго, паціскалі плячыма.

— Хіба ў вас ніколі такога выпадку не было? — пытаюся я.

— Ніколі.

— Ну, а што вы зрабілі-б, каб вам трапіўся заяц?

— Гэтага не было і быць не можа.

— Што-ж усё-такі будзеце рабіць са мною?

Але ў тым і бяда была, што яны зусім не ведалі, што са мною рабіць.

— Можа штрафаваць будзеце? — падказаў я.

— Ды трэ' было-б узяць штраф,—адказаў кантралёр.

— Колькі?

— Мусіць... рублёў шэсць... — прамовіў праваднік.

— А чаму шэсць?

Кантралёры і самі гэтага не ведалі.

Поезд тым часам падышоў да станцыі Шчаслівай. Я вышаў з вагона і стаў чакаць вырашэння свайго лёсу.

Скоса пазіраючы на мяне хлопцы пачалі ціхенька раіцца паміж сабою. Пасля адзін з іх махнуў на мяне рукой і сказаў:

— Ну, ідзіце сабе.

— А як-жа-ж са штрафам?

— Ідзіце, ідзіце. У вас білет быў.

Значыць, мае суддзі разгледзелі не справу з фактычнага боку, па сутнасці, і махнулі рукой на фармальнасць. А па «вялікай» чыгунцы мне не раз даводзілася бачыць, як падыходзілі да справы зусім наадварот...

Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы скончылася. Я пайшоў да выхаду. Ля білетнай касы зноў убачыў «турыста»: ён купляў білет дзявяты раз.

Каля пад'езда нікога не было. Толькі недзе пад ганкам порхаўся ў пяску голы хлапчук у сініх трусіках. Убачыўшы дзядзьку з партфелем, ён палічыў мяне за начальства, вылез з-пад ганку і папрасіўся:

— Я хачу паступіць на чыгунку. Можна?

— На якую работу?

— Машыністам.

— Ну, не. Машыністам рана яшчэ.

— Тады куды-небудзь.

— Зайдзі, пагавары, — параіў я яму і шчыра пашкадаваў гэтага адзінага ў СССР беспрацоўнага чалавека, які наўрад ці атрымае цяпер работу.

... Калі вам давядзецца праязджаць па Малой Беларускай чыгунцы, то яна будзе ўжо ў некалькі разоў даўжэйшая, чыгуначнікаў на ёй будзе каля тысячы чалавек, уся яе гаспадарка будзе значна перабудавана. Разам з іншымі малымі чыгункамі яна будзе падпарадкавана асобнаму Галоўнаму Кіраўніцтву Дзіцячых Чыгунак СССР пры Народным Камісарыяце Шляхоў Зносін.

Тады ўжо губляць білета не раім, бо пэўна на гэты выпадак будуць выданы больш дакладныя і суровыя інструкцыі.



Л. Н. ТАЛСТОЙ. З малюнка работы мастака І. Е. Рэпіна

ВЯЛІКІ РУСКІ ПІСЬМЕННІК

9 верасня 1938 года споўнілася 110 год з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка Льва Нікалаевіча Талстога.

Л. Н. Талстой выступіў на арэну літаратурнай дзейнасці ў часы прыгону. Бязлітасная эксплаатацыя сялян малымі і вялікімі памешчыкамі, здзекі і катаванні сялян прыводзілі апошніх да масавых хваляванняў. «Імкненне змесці да рэшты і казённую царкву, і памешчыкаў, і памешчыцкі ўрад, знішчыць усе старыя формы і ўпарадкаванні землеўладання, расчысціць зямлю, стварыць на месцы паліцэйска-класавай дзяржавы дзяржаву свабодных і роўнаправных дробных сялян,— гэтае імкненне чырвонай ніткай праходзіць праз кожны гістарычны крок сялян у нашай рэволюцыі, і безумоўна, што ідэйны змест пісанняў Талстога больш адпавядае гэтаму сялянскаму імкненню, чым адцягненаму «хрысціянскаму анархізму», як часам ацэньвалі «сістэму» яго поглядаў». (Ленін).

Пачатак літаратурнай дзейнасці Талстога адносіцца да 1852 года, калі ён служыў юнкерам у 4 батарэі 20 артылерыйскай брыгады, якая стаяла ў казацкай станіцы Стараглядаве, на беразе Тэрака. Калі рэдактар журнала «Современник» Некрасаў атрымаў ад Талстога рукапіс аўтабіяграфічнай трылогіі «Маленства», ён зразумеў яе літаратурную каштоўнасць і напісаў Талстому вельмі ветлівае пісьмо. Гэтае пісьмо напоўніла бадзёрасцю сэрца будучага вялікага пісьменніка. Ён вырашае працягваць трылогію, і ў гэты-ж час ён накідвае новыя планы «Раніцы памешчыка», «Набегу», «Казакаў».

Вялікі поспех «Маленства» ў крытыкаў і ў чытачоў меў сваім вынікам тое, што Талстога залічылі ў карыфеі маладой літаратурнай школы, да якой належалі Тургенеў, Ганчароў, Грыгаровіч, Остроўскі і інш.

На Каўказе Талстой пражыў два гады, а калі пачалася Крымская вайна, ён перавёўся ў Дунайскую армію. Тут ён напісаў баявое апавяданне «Рубка лесу» і прыступіў да работы над «Севастопальскімі запіскамі», якія праз дзесяць год паслужылі яму эскізам для разгортвання вялікага гістарычнага палатна — рамана «Вайна і мір».

Першы ў рускай літаратуры Талстой заняўся цвярозым аналізам баявога жыцця, першы аднёсся да яго без усякай экзальтацыі. Ён звергнуў вайсковую доблесць з п'едэстала «суцэльнага» геройства, але разам з тым узвялічыў яе як ніхто. Ён паказаў, што храбрэц данага моманту за мінуту да бою і мінуту пасля яго такі-ж чалавек, як і ўсе. Талстой ярка намаляваў карціны велічы простага геройства, якое не хаваецца за драпіроўку, не лезе наперад, а робіць толькі тое, што трэба: трэба схавацца — хаваецца, трэба паміраць — памірае. Пад Севастопалем у частых баях з ворагам Талстой падружыўся з салдатамі, палюбіў рускага простага салдата, а ў яго асобе—народ. Але Талстому абрыдла жыццё ў цёмнай, неадукаванай краіне і ён паехаў за граніцу.

Пасля звароту з-за граніцы, ён раптам адышоў ад літаратурнай дзейнасці — яго цалкам занялі пытанні адукацыі рабочага насельніцтва.

Адказваючы Чычэрыну на яго апошняе пісьмо 1 сакавіка 1860 года, Л. Н. Талстой піша: «...Усё жыццё нічога не рабіць і эксплаатаваць працу і лепшае дабро чужое, за тое, каб потым узнаўляць іх — дрэнна, нікчэмна, мабыць, ёсць уродства і пакасць, якой я вельмі многа бачыў вакол сябе мерах прыкладаў, каб не жахнуцца... што я раблю — спытаеш ты. — Нічога асаблівага, выдуманага, раблю справу, якая мне таксама натуральна, як дыхаць паветрам...».

Гэты адыход ад літаратуры быў для Талстога нялёгкім. Унутраную духоўную пустэчу ён хацеў запоўніць, перайшоўшы ад мастацкай дзейнасці, якая не давала яму ўнутранага задаволення, да дзейнасці педагагічнай, якая хоць і не поўнасцю, але задавальвала яго маральнае пачуццё, надаючы яго дзейнасці новы сэнс, у выглядзе жывой і плённай працы ў галіне народнай асветы — у сельскай школе.

Вельмі характэрна яго заметка гэтага перыяду ў запісной кніжцы: «Мінулае мучыць мяне, не дае свабодна ісці наперад. А для новага жыцця як быццам мала наперадзе, мала надзеі... Мэта адна — адукацыя народа»...

Але літаратурная дзейнасць Талстога, як думалі некаторыя, не абарвалася. Часовы адыход ад літаратуры быў звычайнымі пошукамі пісьменніка новай глебы для больш плённай работы на карысць народа.

У гэты час крытыка хоць і не пакідала прызнаваць Талстога вялікім пісьменнікам, але адносілася да яго вельмі холадна, не гледзячы на тое, што ім быў надрукаваны цэлы рад яго выдатных апавяданняў: «Мяцель», «Два гусары», «Тры смерці» і інш.

Аднак, з 1862 года пачынаецца другі перыяд творчасці Талстога. У гэтым годзе Талстой друкуе «Казакі», першы з твораў, у якім талент Талстога дайшоў да размераў генія, а ў 1865 годзе ў «Русском вестнике» з'явіўся ўрывак з новага рамана «Вайна і мір».

У рамане Талстога «Вайна і мір» прадстаўлены ўсе класы грамадства, ад імператараў і каралёў да салдата, усе ўзросты, усе тэмпераменты на працягу царствавання Александра I. Уся філасофія рамана зводзіцца да таго, што поспех ці няўдача ў гістарычным жыцці залежаць не ад волі таленту асобных людзей, а ад таго, наколькі яны адлюстроўваюць у сваёй дзейнасці стыхійную падкладку гістарычных падзей.

Але ў «Вайне і міры» Талстой-мысліцель адлюстраваўся далёка не ўвесь і не самымі сваімі характэрнымі старанамі. Калі ў рамане «Вайна і мір» і ў пазнейшых творах няма глыбока-песімістычных настрояў, дык у рамане «Анна Карэніна», які адносіцца да 1873—76 гадоў, шмат душэўнай трывогі, шмат горачы і тугі. Гэты раман з'яўляецца пераходам Талстога да трэцяга перыяду сваёй творчасці.

У гэты-ж час Талстой, каб знайсці адказ на змардаваўшыя яго пытанні і сумненні, кінуўся ў галіну багаслоўя. Размовы з папамі і манахамі, вандраванне да «святых» пустыннікаў прывялі яго да ўмацавання ў ім веры ў тое, што для росквіту ўсеагульнага шчасця неабходна «непраціўленне злу гвалтам», гэта значыць, народ павінен пакорна і спакойна следаваць за ходам гістарычных падзей, гістарычнага развіцця краіны.

Рэзка пратэстуючы супроць паліцэйска-памешчыцкага ладу, супроць казённай царквы, ён у той-жа час прапаведвае новую рэлігію, новую ўтончаную атруту для мас.

Апошні буйны твор «Васкрасенне» Талстой напісаў, калі яму было 70 год. Тэмай для «Васкрасення» былі: адлюстраванне судовага і свецкага быту, паказ свету палітычных злачынцаў. У гэтыя часы ён раз'язджае па судах, каб паслухаць працэсы, гутарыць з юрыстамі, адвакатамі і т. д.; у гэтыя-ж часы ён запісвае ў свой дзеннік:

«Рана прачнуўся. Хадзіў па саду. Усё цяжэй і цяжэй бачыць рабоў, працуючых на нашу сям'ю»...

Альбо аб судзе ў Туле:

«Прачнуўся бадзёра і парашыў ехаць у Тулу на суд. Прачытаў пісьмо і трохі адказаў, і паехаў. Спачатку суд сялян, адвакаты, суддзі, салдаты, сведкі. Усё вельмі нова для мяне. Потым суд над палітычным. Абвінавачаных не за тое, што ён чытаў і распаўсюджваў самаафярна больш справядлівыя і здаровыя думкі аб упарадкаванні жыцця, чым тыя, што існуюць. Вельмі шкада яго...»

Гэтыя запісы выказвалі гарачы пратэст супроць царска-памешчыцкага ладу, супроць бязлітаснай эксплаатацыі шматмільённых працоўных мас жменькай самадураў з «вышэйшага свету», але гэта быў толькі пратэст, бо як «непраціўленец» Талстой заклікаць народ да барацьбы не мог.

На асобнае месца ў радзе мастацкіх твораў Талстога трэба вылучыць аповесць «Хаджы Мурат», напісаную ім у перыяд з 1896 па 1903 год.

Калі ўсе героі талстоўскіх твораў «непраціўленцы злу», усе звычайныя, нармальныя, з «житейской точки зрения», людзі, з усімі іх вартасцямі і недахопамі, у вызначаны перыяд свайго жыцця, пад уплывам тых ці іншых жыццёвых фактаў, усведамляюць раптам усю пустату пражытага імі жыцця і, ударыўшыся ў пошукі «праўды», супакойваюцца толькі на тым, што ўвесь сэнс жыцця знаходзяць у дабры, любві, самаафярнасці і непраціўленні злу гвалтам.

Аповесць «Хаджы Мурат» разрывае гэты ланцуг герояў «непраціўленцаў». Галоўны герой аповесці, дагестанскі партызан Хаджы Мурат, ніяк не можа быць аднесен да непраціўленцаў злу. Гэта—увасабленне самога жыцця і барацьбы. Яго стыхія—гэта актыўная барацьба са зброяй у руках з усім тым, што супярэчыць яму і што ідзе ўразрэз з яго асабістымі разуменнямі аб дабры.

Сваім сябрам і знаёмым Талстой пісаў, што яму, маралісту-непраціўленцу вельмі сорамна на старасці год пісаць аповесць, героем якой з'яўляецца не непраціўленец, а воін, які абараняе свае права на незалежнасць са зброяй у руках. Але яго цікавіў «паралелізм двух галоўных праціўнікаў, Шаміля і Нікалая, прадстаўляючы разам як-бы два полюсы ўладарнага абсалютызма, азіяцкага і еўрапейскага», яму хацелася паказаць «узорнага чалавека-дзікара, чалавека, як выдатны экземпляр жывёлы з пароды людзей, некранутага і несапсаванага цывілізацыяй, і паставіць гэтага чалавека ў сутыкненне з так званым культурным грамадствам».

У сувязі з арыентацыяй на гэтыя «два полюсы» Талстой з аднолькавым асуджэннем падыходзіць і да Нікалая I і да Шаміля, не бачыць прынцыповай розніцы паміж правадыром вызваленчага руху Шамілем і жандарам Еўропы Нікалаем.

Кісць вялікага мастака ў гэтым важнейшым пытанні апынулася ў палоне ў маралісга і непраціўленца, і гераічная барацьба каўказскіх горцаў за сваю незалежнасць і іх правадыр, за якім з неаслабнай увагаю і спачуваннем сачылі Маркс і Энгельс, не знайшлі ў Талстым спачувальнага водгуку. Гэтая-ж акалічнасць перашкодзіла Талстому ўбачыць у асобе Шаміля прадстаўніка новага, прагрэсіўнага пачатку ў гісторыі горскага жыцця.

Аб творчасці Льва Нікалаевіча Талстога мы скажам словамі вялікага генія соцыялістычнай рэволюцыі В. І. Леніна:

«Каб зрабіць яго вялікія творы... здабыткам **усіх**, патрэбна барацьба і барацьба супроць такога грамадскага ладу, які асудзіў дзесяткі мільёнаў на цемру, забітасць, катаржную працу і жабрацтва, патрэбен соцыялістычны пераварот.

І Талстой не толькі даў мастацкія творы, якія заўсёды будуць цанімы і чытаемы масамі, калі яны створаць сабе чалавечыя ўмовы жыцця, скінуўшы прыгнёт памешчыкаў і капіталістаў,— ён здолеў з надзвычайнай сілай перадаць настрой шырокіх мас прыгнечаных сучасным парадкам, абрысаваць іх становішча, выказаць іх стыхійнае пачуццё пратэсту і абурэння. Належачы, галоўным чынам, да эпохі 1861 — 1904 гадоў, Талстой здзіўляюча рэльефна ўвасобіў у сваіх творах—і як мастак, і як мысліцель і прапаведнік — рысы гістарычнай своеасаблівасці ўсёй першай рускай рэволюцыі, яе сілу і яе слабасць»...

Н. ЦІТОЎ.



Па гарадах Совецкага Саюза.
НА ЗДЫМКУ: ў садзе імя М. Горкага г. Растова.

Фото А. Штэйнікава (СФ).

НА РАДЗІМЕ МЕНДЭЛЕ-МОЙХЕР-СФОРЫМА

Капыль — радзіма Мендэле-Мойхер-Сфорыма, аднаго з лепшых дарэвалюцыйных яўрэйскіх пісьменнікаў, класіка яўрэйскай літаратуры, ці, як вобразна празваў яго бяссмертны Шолам-Алейхем — дзядулі яўрэйскай літаратуры. Мендэле-Мойхер-Сфорым стварыў класічны твор аб старым жабрацкім Капылі. Ен і празваў яго — Капцуанск. Цяжка знайсці даслоўны пераклад гэтаму слову, але яно сімвалічна абазначае крайнюю беднасць. У цяперашнім Капылі няма і следу Капцуанска, але ўсё-ж яркае таленавітае геаграфічнае апісанне асобных месц засталося.

Той, хто з захапленнем чытаў творы капыльчаніна Мендэле-Мойхер-Сфорыма, без цяжкасці пазнае цудоўна апісаную «бергело»—горку, з вышыні якой адкрываецца велічэзны від на палі, цяпер ужо не зрэзаныя на дробныя палоскі, а суцэльныя, — далей за імі лясок і шмат навін, якіх пры пісьменніку не было і ў паміне: шырокі стадыён з высокім парканам, новы садовы рассаднік, дамы, фермы... «Горка», якую з такім болем у сэрцы рысаваў Мендэле-Мойхер-Сфорым, была славута тым, што на ёй знаходзіла прытулак самая збяднелая, цярпеўшая крайнюю галечу, бедната.

Пасля Вялікага Кастрычніка лёс самога Капцуанска і тае горкі, дзе тулілася бедната, зусім змяніўся. Людзі, якія некалі насялялі гэтую горку, паміёрлі, а дзеці Лазара Каваля, вадавоза і іншых беднякоў заможна жывуць у калгасах (у самым Капылі тры калгасы), працуюць трактарыстамі, камбайнерамі. Вучацца і заканчваюць навучальныя ўстановы ў Маскве, Ленінградзе, Менску, упраўляюць самалётамі, водзяць паязды, будуюць палацы, робяць новыя вынаходніцтвы. Нават такі розум, як Мендэле-Мойхер-Сфорым, пісьменнік, класік, чалавек з шырокім кругаглядам, не мог уявіць сабе, што вобразы яго герояў адыйдуць у небыццё, Капцуанск стане Капылем, Лейзерке Каваль будзе працаваць у МТС, а дзеці другога героя капыльскага вадавоза, асоба гэта не выдуманая,—называюць прозвішча Лотвіна. Дык вось, дзеці Лотвіна ў калгасе «Кастрычнік», вялікія знатныя людзі.

Так, гэта цікава, калі пісьменнік пакідае нам у спадчыну жывы твор з жывымі героямі і па іх лёсу можна ясна адчуць рост тваёй радзімы, яе гарадоў, сёл, былых «капцуанскіх» мястэчак.

Імя Мендэле-Мойхер-Сфорыма шырока папулярна сярод працоўных Капыльшчыны, і не толькі яўрэйскіх працоўных. Пагутарце з беларускімі калгаснікамі, з байцамі-пагранічнікамі, яны з павагаю гавораць аб тым, што Капыль даў такога майстра мастацкага слова. Бывалыя людзі павядуць вас да таго месца, дзе быццам-бы стаяў домік сям'і пісьменніка, пакажуць будынак, дзе ён вучыўся, раскажуць аб прыгожых Мельніках, жывапіснейшай мясцовасці з ручайком, млынам, дзе раней жыў і працаваў бацька пісьменніка.

У бібліятэцы Дома соцыялістычнай культуры, двухпавярховым будынку нейкай вычварнай архітэктуры, з велізарнымі калонамі, вы знойдзеце да 70 кніг пісьменніка. Сярод іх самыя апошнія выданні кніг, якія карыстаюцца поспехам у чытача. Але тут-жа мімаходам вам паставяць пытанне, чаму Мендэле-Мойхер-Сфорыма не перакладаюць і нават яго славутага «Капцуанска» няма на беларускай мове? У Капылі ёсць яшчэ адзін клуб, спецыяльна рабочых промарцеляў, і там імя класіка яшчэ больш папулярна. Былі выстаўкі, прысвечаныя яму, вечары, збіралі гістарычныя матэрыялы, з якіх відаць, што хоць пісьменнік і выехаў з Капыля, але сувязі з ім не парываў.

«Капцуанск» быў месцам дзікіх здзекаў над беднатой, месцам бязлітаснай эксплаатацыі яе з боку такіх багацеяў-дзяльцоў, як Пейсаховіч, Рывес, Клейнбухт і інш. Шэсць сінагог было ў Капцуанску, царква, касцёл, трактіры і прыстаў займаў лепшы дом мястэчка.

Так было ў часы Мендэле-Мойхер-Сфорыма.

Новы Капыль непазнавальны, ён назаўсёды выцясніў Капцуанск — на ваколіцах выраслі прадпрыемствы, два клубы, дзве дзесяцігодкі, газета, электрастанцыя, кіно, культмагазіны, заўсёды перапоўненыя пакупнікамі, азбрукаваныя вуліцы — гэта і ёсць новае, упарадкаванае мястэчка.

Лёгка ўявіць як праводзілі вечары ў Капцуанску ў бытнасць Мендэле-Мойхер-Сфорыма. Нездарма трактіры ў самым цэнтры мястэчка далучаліся адзін да аднаго. А зараз ледзь вечар, і ў Доме соцкультуры хор спявае песні. У рэпертуары: «Суліко», Казачая песня аб Сталіне, народныя беларускія песні. Ці хор грымне ўдалую, ці драмгурток з мясцовай таленавітай моладзі пакажа новы спектакль! А іншы раз у Дом соцкультуры прыедуць пагранічнікі, і тады весялосць б'е крыніцай.

Новыя людзі Капыльшчыны — гэта дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. С. Рачок. Гэта доблесныя пагранічнікі і адважныя калгаснікі-патрыёты совецкай радзімы, якія адстойваюць ад замахаў ворагаў і ахоўваюць заваёвы ўсёй краіны і поспехі Капыля, якому няма звароту да памершага Капцуанска.

Е. САДОЎСКІ.

НАПЯРЭДАДНІ 20-ГОДДЗЯ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАГА КОМСАМОЛА

КІНОФЕСТЫВАЛЬ У ПРЫГРАНІЧНЫХ РАЁНАХ

Упраўленне па справах кінофікацыі пры СНК БССР вызначыла рад мерапрыемстваў у адзнаку 20-годдзя ленінска - сталінскага комсамола. Сярод асноўных мерапрыемстваў — арганізацыя кінофестываля на граніцы, якім будзе ахоплена восем прыгранічных раёнаў.

Задача кінофестываля — паказаць насельніцтву гэтых раёнаў лепшыя совецкія фільмы. Для гэтай мэты выдзелена 36 фільмаў у колькасці 200 экземпляраў. Апрача стацыянарнага кінотэатра, у кожным раёне будзе працаваць па 4—5 кіноперасовак

Для лепшай арганізацыі кінофестываля ў кожным раёне ствараюцца тройкі ў складзе прадстаўнікоў ад райкома партыі, райкома комсамола і Упраўлення па справах кінофікацыі.

Пасля кожнага сеанса (у часе якога будуць паказаны два фільмы) адбудуцца кароткія абмеркаванні кінокарцін. Да абмеркавання будзе таксама прыцягнут і мясцовы друк.

З іншых мерапрыемстваў трэба адзначыць вельмі цікавае пачынанне — масавае развучванне ў кінотэатрах экранізаваных песень-фільмаў. Упраўленне па справах кінофікацыі атрымала песні-фільмы «Тачанку», «Калі заўтра вайна», «Марш чыгуначнікаў» і інш.

Кінохроніка рыхтуе выпуск спецыяльнага нумара, прысвечанага комсамолу. У бліжэйшых нумарах кінохронікі будуць уключаны тэмы, прысвечаныя комсамолу.

Уся кіносетка забяспечваецца на перыяд юбілея ваенна-абароннымі фільмамі.

Комсамольская арганізацыя Упраўлення па справах кінофікацыі разгарнула соцыялістычнае спаборніцтва. Комсамольцы і моладзь бяруць на сябе абавязацельствы вытворчага, вучэбнага і абароннага характару, а таксама па ажыццяўленню раду мерапрыемстваў, звязаных з лепшым абслугоўваннем насельніцтва.

ДА ЮБІЛЕЮ М. Ю. ЛЕРМАНТАВА

У 1939 годзе совецкая грамадскасць будзе святкаваць 100-годні юбілей з дня смерці вялікага рускага пісьменніка М. Ю. Лермантава.

Пісьменнікі Совецкай Беларусі прыступілі ўжо да перакладу твораў вялікага пісьменніка.

Ніжэй мы друкуем верш М. Ю. Лермантава «Парус» у перакладзе пачынаючых аўтараў

ПАРУС

Бялее парус адзінокі,
Абняты морскай сінявой...
Чаго ён рвецца ў свет далёкі?
Чаму ён край пакінуў свой?

Гамоняць хвалі, вецер грае,
І мачта гнецца і скрыпіць...
О, не! Ен шчасця не шукае,
І не ад шчасця ён бяжыць.

Пад ім блакіт вады іскрыцца,
Над ім праменняў ясных рой.
А ён, мяцежны, к буры мчыцца,
Нібыта ў бурах ёсць спакой.

Пераклалі: МІСЮН, ШАХАВЕЦ, ХАДАРЭНКА, ДЗЯДЗЮЛЯ, КРУЦІЛАЎ, РАДЗЮК, ТКАЧОЎ.

„КАЦЯРЫНА ЖАРНАСЕК"

5 жніўня ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР адбылося праслухоўванне двух актаў новай совецкай беларускай оперы Н. Шчэглова «Кацярына Жарнасек» паводле лібрэта М. Клімковіча. На праслухоўванні прысутнічалі: акторы, рэжысёры, кампазітары, мастакі, пісьменнікі. Першыя два акты оперы прысутнымі былі сустрэты цёпла.

На пашыраным пасяджэнні мастацкага совета тэатра тт. Зораў, Рахленка, Рапапорт, Шапавалаў, Млодэк, Малкін, Каліноўскі, Шнейдэрман, Гантман і інш. абмяняліся сваімі думкамі, зрабіўшы рад патрэбных заўваг. Выступаючыя адзначылі, што кампазітар абраў правільны шлях у напісанні оперы на сюжэт з гісторыі Беларусі, і калі ён у далейшай рабоце будзе прытрымлівацца ўзятага напрамку, то безумоўна створыць новую цікавую совецкую беларускую оперу.

Трэба адзначыць, што папярэдняе грамадскае праслухоўванне оперных твораў у працэсе іх напісання, з удзелам аўтара, салістаў і артыстаў хора, з'яўляецца каштоўным мерапрыемствам тэатра. Абмеркаванне паказала зацікаўленасць работнікаў мастацтваў БССР у стварэнні новых опер. Адначасова яно дапамагло аўтару выявіць рад недахопаў, якіх ён зможа пазбегнуць у сваім творы загадзя.



У пачатку верасня ў г. Віцебску адбылася першая ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці саюза лесу і сплаву. НА ЗДЫМКУ: юныя ўдзельнікі алімпіяды Тамара ЛЯС (злева) і Галя ЖЭЗЕЛКОВА выконваюць «Казачок». Фото Пачкаева (СФ)

Другая Ўсебеларуская выстаўка народнай творчасці

Дом народнай творчасці БССР арганізуе другую ўсебеларускую выстаўку народнай творчасці, прысвечаную XX-годдзю ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Для выстаўкі ўжо сабрана звыш трохсот экспанатаў. Яны ўключаюць вышыўку, ткацтва, разьбу па дрэву, малюнкі, жывапіс, скульптуру. Сярод экспанатаў больш за ўсё прадстаўлены работы лепшых ткачых і вышывальшчыц БССР.

АБ П'ЕСАХ І КАСЦЮМАХ ДЛЯ ДРАМГУРТКОЎ

У Менску налічваецца каля 50 драматычных гурткоў. Вялікая колькасць драмгурткоў ёсць і ў калгасах Менскага раёна. Нажаль, ніхто з Упраўлення па справах мастацтваў не цікавіцца, у якіх умовах прыходзіцца гэтым гурткам працаваць.

Асноўнае, што тармозіць работу драмгурткоў, гэта амаль поўная адсутнасць рэпертуара. Калі выпадкова і знойдзеш у якой-небудзь менскай кнігарні п'есу, дык яна не можа быць скарыстана драмгуртком, бо разлічана на тэатр з 15—20 удзельнікамі. Аднаактных-жа п'ес, скетчаў, інсцэніровак, літаратурных мантажаў—зусім няма.

Няма ў нашых магазінах і тэатральнай літаратуры, напрыклад, твораў Станіслаўскага і іншых тэатральных дзеячоў.

Чаму-ж не адкрыць у Менску, па прыкладу Масквы, спецыяльны магазін ці тэатральны аддзел у кнігарні, дзе-б драмгурткі змаглі дастаць патрэбны ім рэпертуар, кансультацыю?

Вельмі дрэнна абстаіць справа з касцюмамі для пастановак. Ці ведае хто з Упраўлення па справах мастацтваў ці Дома народнай творчасці БССР — што робіцца ў касцюмернай нашага Белдзяржд рамтэатра? Касцюмерная, разлічаная выключна на абслугоўванне самадзейных гурткоў, займае вельмі маленькі пакоік. Працуюць тут дзве жанчыны, якія ніяк не могуць справіцца са сваімі абавязкамі, бо штодня ў гэтым пакойку збіраецца больш 20 чалавек і ўсе разам патрабуюць касцюмаў для чарговых пастановак.

А паглядзець на касцюмы! Рваныя, брудныя — яны зусім не адпавядаюць таму, што гурткам зараз патрэбна. І з-за адсутнасці адпаведных касцюмаў у драмгуртках часта зрываюцца пастаноўкі. Напрыклад, у 20-й менскай школе была сарвана пастаноўка «Без віны вінаватыя», у Мендарбудзе была сарвана пастаноўка «Месяц злева», у 29-й школе сарвана выступленне гуртка самадзейнасці ў часе першамайскай дэманстрацыі і т. д. — і ўсё гэта з прычыны адсутнасці касцюмаў для класічных пастановак, нацыянальных касцюмаў і інш.

Шмат часу прыходзіцца траціць гуртко ўцу на падбор патрэбнага яму касцюма. А калі, нарэшце, касцюм знойдзены і падабраны, то трэба палічыць, ці хопіць у гуртку грошай на аплату праката. Бо за пракат усякага трап'я дырэкцыя тэатра бярэ ад адчаго да трох рублёў у дзень.

Той-жа малюнак у адносінах да парыкоў. Рэквізіта ў касцюмернай няма, за выключэннем двух драўляных пісталетаў дапятроўскага часу, а за пракат іх бяруць па аднаму рублю ў дзень.

Каб атрымаць дапамогу грыміроўшчыка, трэба папрасіць тэатральных работнікаў, якія таксама сваю працу танна не расцэньваюць і менш як па 75 рублёў за вечар не бяруць. Калі-ж звяртаешся да дырэкцыі тэатра, то яна заяўляе, што касцюмерная ёй даўно абрыдла, што яна мяркуе зусім яе ліквідаваць, і гэта не гледзячы на тое, што даход ад праката «касцюмаў» дасягае дзесяткаў тысяч рублёў.

Час ужо Упраўленню па справах мастацтваў і Дому народнай творчасці сур'ёзна заняцца пытаннямі абслугоўвання драмгурткоў, у першую чаргу ў Менску, і дабіцца ўзорнай касцюмернай для іх і адкрыцця спецыяльнага магазіна тэатральнай літаратуры і п'ес.

ПАЧАЧУЕЎ.

ДВА ДЖАЗЫ

Як толькі першыя гукі гэтага незвычайнага аркестра, у якім некаторыя інструменты ледзь не большыя за сваіх выканаўцаў, далятаюць да вашых вушэй, адразу робіцца ясным, што перад вамі не паказ фізічных асаблівасцей ліліпутаў, на якіх яшчэ з часоў феадалізма спекуліравалі прыватныя прадпрыемцы, а дэманструецца таленавіты калектыў цудоўных музыкантаў, спевакоў і танцораў, займаючы па сваёй якасці і незалежна ад росту пачэснае месца сярод цэлага раду мастацкіх калектываў Совецкага Саюза. Кіно-джаз—тэатральна-музыкальны атракцыён, выступаючы цэнтральным нумарам апошняй праграмы Менскага дзяржцырка, нездарма выклікае ўрачыстыя водгукі ў гледачоў, аднадушна ўхваляючых маленькіх выканаўцаў і іх арыгінальную трактоўку выканання. Дасціпны дырыжор Дуглас, вясёлы ўдарнік Чарлі, неразлучныя Пат і Паташон і ўсе астатнія тыпажы кіно-славутасцей выкананы артыстамі здзіўляюча дакладна і ярка. Дастаткова сказаць, што Петэр у выкананні артысткі Вержбіцкай значна цікавейшы, чым у многіх выканаўцаў гэтага нумара.

Аб гэтым цудоўным джазе хочацца гаварыць з усёй сур'ёзнасцю, і таму, жадаючы яму поспеху і далейшай плённай работы, варта адзначыць некаторыя недахопы гэтага нумара.

Музыкальны кіраўнік джаза С. С. Гальперын прарабіў у кароткі тэрмін велізарную работу ў галіне авалодання джазам музыкальнай культурай і тэхнікай выканання. Некаторая няроўнасць ігры тлумачыцца тым, што большасць выканаўцаў іграе ўсяго тры гады (уключаючы сюды вучобу). Але гэта не зніжае вялікай музыкальнасці і цудоўнага гучання джаза. Такому трубачу, як Паташон (арт. Краўцоў) могуць пазайздросціць многія музыканты, іграючыя на гэтым інструменце. Не зусім так абстаіць справа з мастацкай тэатралізацыяй джаза. Яна не пазбаўлена цікавасці, але засталася амаль без змен з тых даўніх часоў, калі кіно-джаз быў проста шумавым аркестрам. Свежасць мастацкай кампазіцыі і дасціпнасць сцэнарыя не павінны адставаць ад хутка растучай музыкальнай культуры джаза. Апрача таго, сама назва «кіно-джаз» абавязвае не толькі да паказу ўдала выкананых тыпажаў, але і да паказу характэрных дзействаў гэтых персанажаў, чаго, за малым выключэннем, у джазе няма. Мастацкаму кіраўніку М. С. Качурынеру гэта варта ўлічыць у сваёй далейшай рабоце з «кіно-джазам», які сваім майстэрствам бясспрэчна заваяваў любоў і павагу менскага гледача.

Ні таго, ні другога не змог дамагчыся працуючы ў сучасны момант на летняй эстрадзе кіно «Чырвоная зорка» джаз пад кіраўніцтвам бр. Жукавых.

Ленінградскі гарком работнікаў эстрады, які, па словах дырэктара кіно, рэкамендаваў гэты джаз, не ўпершыню з'яўляецца пастаўшчыком нядобраякаснай прадукцыі. Б. Жукавы, старыя работнікі эстрады ў галіне танца, па невядомых акалічнасцях узначалілі музыкальны калектыў, не маючы на гэта ні музыкальнага, ні мастацкага права. Гэта адбіваецца на ўсім выкананні джаза. Уласцівай джазу музыкальнай выразнасці і вастрыні выканання няма і ў паміне. Невыразнай мовай адзін з Жукавых ляпеча надзіва плоскія жарты і нават спрабуе спяваць. На шчасце, яго голас чуваць не далей другога раду. Па свайму гучанню джаз недалёка адышоў ад аматарскага аркестра, што асабліва адчуваецца ў выкананні песень нашай радзімы, а гэтыя песні патрабуюць ад музыкантаў любоўнага выканання і дакладнай аддзелкі. Што датычыць вакальнай часткі джаза, якую прадстаўляе спявачка Д. М. Пракофьева, то яе выкананне вельмі блізкае да манеры выканання псеўдацыганскага раманса ў горшым значэнні гэтага слова. Не лепш абстаіць справа і з тэатралізацыяй выконваемага джазам матэрыялу. Пра яе маглі чытаць толькі ў афішы, калі не лічыць такіх патуг на тэатралізацыю, калі Жукаў-ударнік у часе выканання джазам «Сама садик я садила» ўтыкае ў сваё прозвішча, на фоне якога выступае джаз, некалькі кветак.

Але гэта наўрад ці дапаможа джазу расквітнець у сапраўдны мастацкі калектыў да таго часу, покуль кіраўніцтвам не зоймуцца сапраўдныя творчыя работнікі.

Мы маем права патрабаваць ад джазаў, якія прыязджаюць да нас з такога культурнага цэнтра, як Ленінград, сапраўднага, вялікага мастацтва, аптымістычнага і бадзёрага.

Марк ФРАДКІН.

ЗАКЛЮЧНАЯ ПРАГРАМА ЦЫРКА

Будзе справядліва, калі мы скажам, што Менскі дзяржцырк у летнім сезоне 1938 г. прадэманстраваў на арэне рад разнастайных і, у большасці выпадкаў, змястоўных праграм. Не ў прыклад мінулых год, у гэтым годзе не было застойных нумароў і доўга-незмяняемых «цыклаў».

Прыходзіцца шкадаваць аб тым, што выступленні славутага дрэсіроўшчыка жывёл, клоуна Шафрыка былі запланіраваны дырэкцыяй на кароткі тэрмін. Работа на арэне Шафрыка заслугоўвае вялікай увагі, як цяжкі, дасягнуты крапатлівай працай і вялікай цярплівасцю сапраўдны цыркавы нумар, які з велізарнай увагаю праглядаецца гледачом.

Дзяржаўная канюшня пад кіраўніцтвам дрэсіроўшчыка Хурсанава, адкрыўшая сезон гастроляў шапіто, за ўсё лета не здзівіла менскага гледача нічым выдатным, зусім магчымым у тэхніцы коннай дрэсіроўкі і цярпліва чакаемым публікай доўгі тэрмін. Аб Хурсанаве можна сказаць: работа чыстая, роўная, зусім здавальняючая, але з'яўленне на арэне хурсанаўскай канюшні стала насіць характар абавязковага, афіцыяльнага і, бадай, значна надаеўшага цыркавога нумара. Дрэсіроўшчык Хурсанаў рабіў спробу асвяжыць свой конны паркур. Коннае табло чамусь надоўга патрымалася ў праграме выступленняў канюшні, а гэта работа дрэсіроўшчыка з усяго паказанага Хурсанавым найбольш цікавая і са здавальненнем прымаемая гледачом цырка.

Хочацца па асабліваму выказацца аб цудоўным выступленні Рудзіф — «качаюшаяся пальма», як аб лоўкім совецкім акрабаце, цікава зрабіўшым свой нумар, па сутнасці — цыркавым атракцыёне. Эксцэнтрычнае вырашэнне выступлення, здаровы трук, бездакорнае выкананне пераконвае ў правільным напрамку совецкай цыркавой школы, у скромнасці нашага артыста арэны. Але тым не менш была-б магчымасць яшчэ больш поўна насыціць антрэ Рудзіф цыркавой, забаўляючай гледача зацеяй, а для гэтага ў здольнага цыркавога актора, якім з'яўляецца «індзеец на пальме», трэба меркаваць, здольнасцей хопіць.

Робіць выключнае ўражанне нумар акрабатаў на турніках Капыцыных. Капыцыны — упрыгожанне цыркавой праграмы, асабліва пасля таго, як яны ўвялі бісавае выступленне на доўгай дыстанцыі з вынятым сярэднім турнікам. За дабаўленне ў свой выхад клоуна-акрабата застаецца толькі вітаць гэтую бліскучую акрабатычную групу, і глядач шчыра, ад душы, узнагароджвае маладых совецкіх цыркачоў дружнымі авацыямі.

Да афектных нумароў праграмы трэба аднесці работу з талерачкамі Ван-Чу (чаму Ван-Чу? — дзіўна! Нашто рускаму совецкаму актору кітайскае прозвішча, калі і ў выступленні гэтым кітайскага нічога няма, а ёсць проста цудоўны нумар добрага жангліравання, вырашаны і пастаўлены з вялікім густам).

Жанглёры Бауман безумоўна здольныя акторы манежа і эстрады, але нумар іх вельмі звычайны, пазбаўлены арыгінальнасці і, граха няма чаго таіць, маладыя жанглёры часта робяць недаравальныя «накладкі» — тое, што глядач даруе акрабату і падбадзёрыць яго за дапушчаны зрыў, падтрымае паўторнае выступленне ў рэпрызе, але той-жа глядач асудзіць промах жанглёра, ведаючы, што калі жанглёр робіць «накладку», значыць, не сочыць за сабой, не трэніруецца, неахайна адносіцца да гледача.

Работа з японскім першам у эквілібрыстычным балансе Амі як раз у процілегласць маладым жанглёрам, сведчыць аб вельмі сур'ёзных адносінах здольных эквілібрыстаў да свайго нумара на манежы.

Цікавая і эфектная работа паветраных акрабатаў-гімнастаў пад купалам Сінькоўскай і Лісіна. Акторы здолелі спалучыць у сваім выступленні акрабатычную лоўкасць, трук і эфект, заканчваючы нумар своеасаблівым «лопен-дэ-лоп».

Добра ўспрымаецца гледачом снайперы Мільтонс. Але пры наяўнасці снайперскіх здольнасцяў усяму выступленню Мільтонс усё-такі нехапае сапраўднага цыркавога эфекта. Можа быць, па сваёй прыродзе нумар гэты павінен быць стрымана-сур'ёзным, але ўсё-такі цырк застаецца цыркам і кожны нумар павінен быць прыпраўлен некаторай доляй эксцэнтрыкі, калі не гумару. Урачыста-афіцыяльныя паводзіны перад гледачом ніколі не былі спадарожнікамі цыркавога актора.

Добра задумана выступленне акрабатаў — «няўдачнікаў» Мельчанка,—але нумар, бадай, яшчэ сыраваты, да публікі канчаткова не даходзіць, не смяшыць. Выканаўцам трэба моцна падумаць аб клоунскай эксцэнтрычнасці свайго выхаду, на што яны прэтэндуюць па свайму цыркавому пашпарту.

З прыемнасцю глядзіцца работа двух Хеллі, акрабатаў эластычнага жанра, і зусім асаблівае становішча ў праграме займае цікавае выступленне групы актораў—выканаўцаў ікарыйскіх гульняў пад кіраўніцтвам Александрава. Тэмперамент выканання, жвавасць у пераходах ад становішча да становішча, літаральна матэматычны разлік падкідвання маленькіх актораў, адсутнасць штампа і капіравання ўсяго дасягнутага ў гэтым жанры раней, нават сам выхад на сцэну, не гавора чы ўжо аб касцюмах, дзейнічае падкупляюча. «Ікарыйцы», таму, праходзяць у гледача з поспехам, якому можа пазайздросціць кожны выканаўца гэтай праграмы. Нумар зроблены з вялікім густам, у тонкім разліку на імкненне да добрага дасягнення ў цыркавым майстэрстве. І імкненне гэтае, безумоўна, дасягнула выдатнага рэзультату.

Некалькі слоў аб сатырыках бр. Гаварашчых. Імкненне бр. Гаварашчых да злабадзённых, «не замызганых» нумароў у сваім, трэба сказаць, надзвычай вялікім і заўсёды свежым рэпертуары, вельмі пахвальна. Сатырыкі заслужана прылічаны, за сваю працяглую і цікава праведзімую работу, да лепшых майстроў гэтага, вельмі цяжкага, жанра совецкай эстрады і кожнае антрэ іх цікавае. Рэпертуар бр. Гаварашчых не лёгкадумны, не фрывольны, на што часта грашаць акторы сатыры. Здавалася-б,—у моц гэтага, — усе іх выступленні не зусім падыходзяць для цыркавога манежа, але ўсе іх выступленні прымаюцца ўважліва і маюць поспех. Трэба было-б папракнуць сатырыкаў за вялікай даўнасці нумар,—«кравец і шавец», але і гэтая, спаконвеку захаваўшаяся ў іх рэпертуары рэч падкупляе вялікай і цікавай тэхнікай. Дзелавыя адносіны да змястоўнага рэпертуара, палітычна насычанага і вострага, ідэйна вытрыманага, заўсёды былі спадарожнікамі бр. Гаварашчых.

Некалькі асаблівае становішча займае ў праграме цырка трэцяе аддзяленне, гэта выступленне цыганскага ансамбля пад кіраўніцтвам Орловай. Перш за ўсё, ансамбль цікавы ў сваёй этнаграфічнасці, пазбаўлены псеўдацыганскай таннасці, скромны, не крыклівы, з праграмай добрых песень і танцаў ад душы. Але трэба падумаць, што падобны ансамбль, маючы ўсе правы на выступленне спецыяльным аддзяленнем у эстрадна-канцэртнай праграме, ці падыходзіць для выступлення ў праграме цырка-шапіто?

Здольны Сенічка Рэдзькін, безумоўна, расце як своеасаблівы клоун-разгаворкін. Усе яго антрэ ўдалыя, не пазбаўлены дасціпнасці. «Гутарка з чужаземцам аб совецкіх лётчыцах» — змяшчае ў сябе вялікі палітычна-агітацыйны змест.

Ворагі, якія прабраліся ў цэнтральнае кіраўніцтва Дзяржцырка, усяляк падрывалі аўтарытэт выдатнай школы совецкага цырка, зніжаючы яе вялікае выхаваўчае значэнне, прыцягваючы на манеж замежныя атракцыёны, без якіх быццам наш дзяржаўны цырк існаваць, на іх думку, не мог; але ў абвяржэнне шкодніцкай палітыкі растуць цудоўныя совецкія цыркачы, любячыя сваё добрае цыркавое мастацтва, на арэне ў штодзеннай і цудоўнай працы сваёй збліжаючыся з паважаючым іх совецкім гледачом. З кожным годам усё больш і больш мацнее совецкі дзяржаўны цырк, як школа дэманстрацыі сілы, лоўкасці, эксцэнтрыкі, здаровых трукаў, як вялікая школа любімага совецкім народам высокага мастацтва цыркавой арэны.

Влад. МУРАТ.

Дырэкцыя, мясцком і калектыў Беларускага Дзяржаўнага Драматычнага тэатра з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай трагічнай смерці актора тэатра

ІВАНА НІКІЦІЧА АНТОНАВА

і выказваюць спачуванне сям'і загінуўшага.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрэс рэдакцыі газеты: Менск. Совецкая, 76. Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № К—5623.